Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК БССР
XIII год выданьня
штодзённая газэта

СУБОТА
7 МАЯ 1932 г.
№ 100 (3489)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сэктараў 6-15
Начная рэдакцыя . 12-65 (два эталёны)
Выдавецтва . . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на поштах і пістаносцямі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радка нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб зьезде 1 дакумэнту—3р

Москва, Кремль, Правительств. библ-ка ССР и РСФСР. янв-дек СГ-2 | 1932 |

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Зьезд камандзіраў вытворчасьці. А. ХАЦКЕВІЧ—Аб бліжэйшых задачах фінансавай работы—2 стар. Г. ЧАРВЯКОВА—Чарговыя задачы ў барацьбе за пісьменнасьць—3 стар.

Пяцігадовы юбілей работы т. ГАЛАДЗЕДА на пасадзе Старшыні СНК БССР—1 стар.

Па СССР—1 стар.

Трусагадоўля павінна стаць новай магутнай крыніцай рабочага забесьпячэньня—3 стар.

Упарта змагацца за ўшчыльненьне тэрмінаў оэўбы—баявая задача кожнай брыгады—2 стар.

«Рашучая і сыстэматычная барацьба з коснасьцю, бюракратызмам, цыганінай у нашых апаратах зьяўляецца аднэй з істотных задач партыі і рабочае клясы» (Сталін)—2 стар.

Прамысловасьць пачынае адчуваць прарыў у загатоўках скурсыравіны.—2 стар.

За границай: Пратэст генэральнага консула СССР ў Харбіне. Нанкінская кліка капітулявала. Слова і справы японскіх імпэрыялістаў. Напружанае становішча ў Харбіне. Партызанскі рух у Манчжурыі пашыраецца—4 стар.

Зьезд камандзіраў вытворчасьці

IV усебеларускі зьезд інжынэрна-тэхнічных работнікаў пачынае сёньня сваю працу ва ўмовах, калі XVII усесаюзная партыйная канфэрэнцыя паставіла перад усёй партыяй, рабочай клясай і шматмільённымі масамі працоўных сусьветна-гістарычнага значэньня задачу пабудаваць на працягу бліжэйшых пяці год бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва на падвычайна высокім гаспадарчым фундаманце, пры поўнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, пры падвядзеньні навейшай тэхнічнай базы пад усе галіны народнай гаспадаркі нашай краіны.

Зусім зразумела сувязь посьпехаў барацьбы за пляны першай гераічнай пяцігодкі, якую савецкая краіна сама ахвярна выконвае ў чатыры гады, з разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва ў другую пяцігодку—пяцігодку пабудовы сацыялізму. Мы толькі што падвялі вынікі выкананьня прамфінпляну нашымі прадпрыемствамі за мінулы першы квартал апошняга году пяцігодкі. Трэба сказаць, што разам з буйнейшымі посьпехамі, разам з новымі вялізарнымі перамогамі, дасягнутымі намі за гэты час, мы мелі і адставаньне паасобных галін прамысловасьці БССР, асобных нашых прадпрыемстваў як па лініі выкананьня як колькасных, так і якасных паказьнікаў.

Дзе прычына, дзе карэньні тых асобных прарываў, тых асобных буйных недахопаў у рабоце раду галін нашай прамысловасьці і раду нашых прадпрыемстваў? Зусім зразумела, што справа не ў «аб'ектыўных» умовах, бо рэальнасьць нашых пляноў—гэта мы самі, жывыя людзі, шматмільённыя масы рабочых, якія адда на змагаюцца за сацыялістычнае будаўніцтва. Зусім зразумела, што карэньні готых асобных прарываў і недахопаў, гэтага адставаньня асобных прадпрыемстваў—няўменьне на-новаму працаваць, няўменьне на справе ажыцьцявіць шасьць гістарычных умоў пра падыра нашай партыі, умоў, якія зьяўляюцца гаспадарчай праграмай нашай партыі.

Зусім зразумела таксама і тое, што нам неабходна ў другім квартале пакрыць запазычанасьць па прамфінпляну, якая атрымалася ў першым квартале, і забясьпечыць пасьпяховае выкананьне задач чацьвёртага заключнага году пяцігодкі. Нам трэба дамагчыся таго, каб у бліжэйшыя-ж дні і тыдні ўзяць такія тэмпы, якія-б забясьпечылі нам такое завяршэньне пляну бягучага году, на якое сапраўды здольны бальшавікі, з тым, каб пасьпяхова ўсім фронтам уступіць у другую пяцігодку.

І ў гэтай барацьбе надзвычайна адказная роля прыпадае на інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

Другая пяцігодка па сваіх папярэдніх наметках адначае гіганцкі крок наперад у справе выкананьня бальшавіцкага лёзунгу «дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах». На працягу другой пяцігодкі на чыгуну, вугалі, нафце, аўтамабіля будаўніцтва мы выйдзем на першыя месцы і будзем адставаць крыху толькі ад ПАЗШ у час іх найбольшага росквіту. Мы па машынабудаўніцтву, па гэтай галіне ўсёй народнай гаспадаркі нашай краіны, перагонім усе капіталістычныя дзяржавы. Мы па электраэнэргіі дасягнем узроўню ПАЗШ. Наша лёгкая індустрыя возьме такія тэмпы, якія забясьпечаць павышэньне ў два-тры разы ўзроўню спажываньня рабочых і працоўных нашай краіны. Мы цалкам абагулім і механізуем усю сельскую гаспадарку.

Другая пяцігодка будзе адзначаць новыя посьпехі ў барацьбе за правільнае разьмяшчэньне вытворчых сіл на шай краіны. Зараз ажыцьцяўляюцца, ператвараюцца ў рэальнасьць прароцкія словы Энгельса аб тым, што «тэльгі грамадзтва, якое здольна гарманічна прыводзіць у рух свае вытворчыя сілы, згодна адзінага пляну, можа арганізаваць іх так, што будзе магчымасьць роўнамерна разьмяркаваць буйныя прамысловыя прадпрыемствы па ўсёй краіне, зближаючы прамысловую вытворчасьць з сельска-гаспадарчай так, як гэта неабходна для разьвіцьця і захаваньня вытворчых сіл».

Работа над другой пяцігодкай, пад не канкрэтызацыяй, дэталізацыяй і ўдасканаленьнем шырокай хваляй разгортваецца ва ўсёй краіне. У гэтай рабоце асабліва пачэснае месца павінны заняць інжынэрна-тэхнічныя работнікі. На кожным заводзе і фабрыцы, у кожным трэсьце і аб'яднаньні, на кожным вытворчым вучастку інжынэрна-тэхнічныя работнікі павінны быць у першых радох шырокага руху мільённых мас за распрацоўку другой пяцігодкі.

IV усебеларускі зьезд інжынэрна-тэхнічных работнікаў пачынае сваю работу напярэдадні першай гадавіны гістарычнай прамовы т. Сталіна «Новыя абставіны—новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва». У гэтай сваёй прамове т. Сталін высунуў перад усёй партыяй дзьве задачы, якія непасрэдна датычацца інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

«...лабіцца таго, каб у рабочай клясе СССР была свая ўласная вытворча-тэхнічная інтэлігенцыя—такава задача».

«...зьмяніць адносіны да інжынэрна-тэхнічных сіл старой школы, праяўляць да іх больш увагі і клопатаў, сьмялей прыцягваць іх да работы—такава задача».

Гэты год быў годам напружанай работы над ажыцьцяўленьнем ўсіх шасьці ўмоў т. Сталіна, у тым ліку і гэтых дзьвюх. За гэты год мы атрымалі новыя сотні і тысячы інжынэрна-тэхнічных работнікаў з асяродзьдзя рабочай клясы. За гэты год магутна разгарнулася барацьба за ажыцьцяўленьне лёзунгу т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай. Тысячы і дзесяткі тысяч рабочых ахоплены тэхвучобай, аўладаюць тэхнікай вытворчасьці новых галін прамысловасьці новых гігантаў нашай індустрыі. За гэты час значна ўзрос рух вынахоцтваў і рацыяналізатараў. Але было-б няправільна думаць, што на гэтых посьпехах можна супакоіцца. Нам трэба яшчэ больш напружана працаваць у гэтым напрамку.

З другога боку, мы дамагліся значных посьпехаў і ў ажыцьцяўленьні тых задач у адносінах да інжынэрна-тэхнічных сіл старой школы, якія паставіў перад намі ў сваёй прамове т. Сталін. Яркай ілюстрацыяй гэтаму зьяўляецца хоць-бы вядомая пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК ССР аб пабудове дамоў для спэцыялістаў, аб паляпшэньні забесьпячэньня іх. І той факт, што значныя масы інжынэрна-тэхнічных работнікаў, вялізарнейшая большасьць іх самааддана, у нагу з рабочай клясай, плячо ў плячо з ёю працуе на сацыялістычным будаўніцтвам, што больш ²/₃ ІТР БССР знаходзяцца ў радох ударнікаў—гэта яскрава сьведчыць аб тым, што «новая абстаноўка павінна была стварыць і сапраўды стварыла новыя настроі сярод старой тэхнічнай інтэлігенцыі».

Мы вітаем IV усебеларускі зьезд ІТР і жадаем яму пасьпяховай, прадукцыйнай работы.

Пяцігадовы юбілей работы тав. ГАЛАДЗЕДА на пасадзе Старшын іСНК БССР

Паважаны Мікалай Мацьвеевіч!

У дзень пяцігодзьдзя Вашай бальшавіцкай работы на адказнейшай пасадзе Старшыні СНК БССР рэдакцыя «САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ», яе чытачы і рабселькоры шлюць Вам—цьвёрдаму бальшавіку, выдатнейшаму работніку рабоча-сялянскага ўраду БССР—шчырае, гарачае таварыскае прывітаньне.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, незамірыма змагаючыся за генэральную лінію партыі і яе неадрыўную частку ленінскую нацыянальную палітыку, Вы за сваю пяцігадовую работу ў якасьці старшыні СНК БССР прымалі актыўны ўдзел у пераможнай барацьбе рабочых і працоўных БССР за справу рабочае клясы, за справу сацыялізму. Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, пры дапамозе пралетарыяту і працоўных СССР, ажыцьцяўляючы волю ленінскай партыі, рабоча-сялянскі ўрад БССР—фарпосту Савецкага Саюзу на мяжы з капіталістычным сьветам—дабіўся вялізарнейшых посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Ваш актыўны непасрэдны ўдзел у складаньні пляну першай пяцігодкі, Ваша выдатная рэбота ў барацьбе за яе ажыцьцяўленьне, за складаньне плянаў 2 пяцігодкі, за справу пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач 4-га апошняга году пяцігодкі гаворыць аб тым, што Вы ішлі і ідзеце ў першых радох барацьбітоў за сацыялізм.

Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» жадае Вам яшчэ доўга і карысна змагацца пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі за справу рабочае клясы, за справу сацыялізму, за справу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

МЕНШЧЫНА ВІТАЕ

Паважаны Мікалай Мацьвеевіч!

Менскі гарадзкі савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў у дзень 5-гадовага прабываньня на пасту старшыні Савету Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі шле шчырае прывітаньне табе, моцнаму загартаванаму бальшавіку, ад рабочых, калгасьнікаў і працоўных мас г. Менску і раёну.

Пры тваім актыўным удзеле, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, Савецкая Беларусь і асабліва г. Менск дасягнуў вялізарнейшых посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Пры тваім кіруючым удзеле, у прыватнасьці г. Менск, пабудаваў трамвай, шмат новых дамоў, унівэрсытэт, Клінічны гарадок, будуе ТЭЦ,—ператварае Менск у сапраўдны сацыялістычны горад.

Гарадзкі Савет спадзяецца, што ты і надалей будзеш у першых рядох КП(б)Б на фронце барацьбы за справу сацыялістычнага будаўніцтва, што Савецкая Беларусь і асабліва яе чырвоная сталіца г. Менск, пры тваім актыўным кіраўніцтве і непасрэдным удзеле, будзе атрымліваць перамогу за перамогай у барацьбе на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Жадаем табе і надалей здароўя і сіл у тваёй пладатворчай рабоце на фронце барацьбы за справу сацыялізму.

Менскі Гарадзкі Савет

Старшыні СНК Беларусі

Сьвяткуючы міжнароднае сьвята сусьветнага пралетарыяту 1-га мая, мы камандзіры, палітработнікі і ўсе байцы бранявога дывізіёну запаўніваем ленінага бальшавіка ганаровага шэфа бранявых машын у тым, што ўвесь бранявы дывізіён, з усёй матар'яльнай часткай, з усім асабовым складам да абароны заваёў Кастрычніка гатоў і на першым заклику партыі і ўлады выступіць для зьнішчэньня ворагаў, якія імкнуцца сарваць мірнае будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Нехай жыве УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным.

Нехай жыве старшыня Саўчаркому Беларусі—Галадзед, ганаровы шэф брыгавой машыны.

Нехай жыве пралетарыят усяго сьвету.

Ганароваму чырвонаармейцу №-скага палка

Старшыні СНКБ тав. ГАЛАДЗЕДУ

Начсклад і чырвонаармейцы №-скага палка вітаюць у вашай асобе працоўныя масы БССР з міжнародным рэвалюцыйным сьвятам—1 мая.

Мы, байцы і начсклад па-бальшавіцку змагаемся за высокую якасьць палітычнай падрыхтоўкі. Да летняй вучобы мы падышлі без запазычанасьці. Пры інспэктарскай праверцы палітзаняткаў полк даў 88 проц. на добра, 22 проц на здавальняюча. Слабых няма. Занята рад першых месц у бавой падрыхтоўцы дывізіі.

КАМАНДЗІР І КАМІСАР №-СКАГА ПАЛКА.

Старшыні СНК БССР

Усебеларускі палітыка-асьветны інстытут і тэхнікум у дзень Вашага пяцігадовага знаходжаньня на пасадзе старшыні Савету Народных Камісараў БССР шлюць шчырае бальшавіцкае прывітаньне. Пытаньні навукі і асьветы заўсёды знаходзяць вялікую ўвагу з Вашага боку як вытрыманага ленінца, няўхільнага змагара за генэральную лінію партыі.

Мы ўпэўнены, што Вы і ў далейшым будзеце самаадданым загартаваным бальшавіком у справе пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Дырэктар п-асьветінстытуту і тэхнікуму П. Капаевіч.

На ўрачыстым аб'яднаным пасяджаньні Прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР

5-га мая адбылося 5 год з дню вылучэньня Мікалая Мацьвеевіча Галадзеда на пост старшыні Савету Народных Камісараў БССР. У гэты-ж дзень адбылося ўрачыстае аб'яднанае пасяджаньне прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР, прысьвечанае юбілею.

Пасяджаньне адкрыў намесьнік старшыні Савету Народных Камісараў тав. Бэнэк, які у сваёй уступнай прамове перш за ўсё ахарактарызаваў Мікалая Мацьвеевіча, як ленінага вылучэнца на адказны пост кіраўніка Беларускага ўраду.

Пяць год работы, М. М. Галадзеда, у якасьці старшыні Савету Народных Камісараў—палкрасьліў тав. Бэнэк—былі буйнейшымі дасягненьнямі БССР ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Тав. Галадзед па кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, у першыя-ж дні пасьля ўступленьня на пасаду старшыні СНК, правёў надзвычайна вялікія здольнасьці кіраўніка ўсёй савецкай работай, найвялікшую бальшавіцкую вытрыманасьць, прамату, катэгарычнасьць у пастаноўцы пытаньняў эканамічнага і культурнага будаўніцтва. Гэта асабліва яскрава выявілася пры складаньні першай пяцігодкі, пры нясупынным бальшавіцкай барацьбе за выкананьне колькасных і якасных паказьнікаў.

З гарачым прывітаньнем ад імя ЦК КП(б)Б выступіў пасьля ўступнай прамовы тав. Бэнэка, сакратар ЦК тав. Гікала. Тав. Гікала ахарактарызаваў Мікалая Мацьвеевіча як стойкага, вытрыманага бальшавіка-ленінца, які з бальшавіцкай праматой, сьмела ставіць пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, які ўпарта, бязупынна праводзіць генэральную лінію нашай партыі. Пад бурныя воплескі тав. Гікала закончыў сваю прамову пажаданьнем Мікалаю Мацьвеевічу Галадзеду здароўя, пасьпяховай барацьбы за выкананьне другой пяцігодкі на адказнейшым пасту кіраўніка ўраду ў краіне, якая знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным сьветам.

З вялікай цяплынёй вітаў юбіляра і старшыня ЦВК БССР тав. Чарвяковаў, пасьля якога выступалі: старшыня Менгарсавету тав. Валодзька, старшыня ЦОИСВ тав. Рыжоў, член прэзыдыуму ЦКК тав. Жолудоў, намесьнік старшыні СНК тав. Грысевіч.

Пяцігадовая работа тав. Галадзеда на пасадзе старшыні Савету Народных Камісараў была адначана як шлях бальшавіка-ленінца, як нарыяд нарыжанай барацьбы за генэральную лінію партыі супроць усякіх ухілаў ад яе, за ленінскую нацыянальную палітыку.

У адказ на прывітаньне тав. Галадзед кароткa спыніўся на асноўных этапах работы.

— Мяне выхавала ленінскае партыя,—сказаў тав. Галадзед,—я чыталі не забываю, што на адказнейшай пасадзе Старшыні Савету Народных Камісараў, я перш за ўсё зьяўляюся членам партыі, які павінен сваёй работай апраўдаць давер'е партыі.

Бурныя апэдысманты пакрылі апошнія словы юбіляра.

Старшыні Савету Народных Камісараў БССР

Мікалаю Мацьвеевічу Галадзеду

Магілёўская сэкцыя навуковых працаўнікоў у дзень пяцігадовага знаходжаньня на пасадзе старшыні Савету Народных Камісараў шчыра вітае лепшага ленінца, загартаванага бальшавіка тав. М. М. Галадзеда.

Вы, паважаны Мікалай Мацьвеевіч, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б прайшлі шлях напружанай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць усякіх ухілаў ад яе, за ленінскую нацыянальную палітыку. Пытаньні навукі заўсёды знаходзяць з Вашага боку вялікую ўвагу.

Мы ўпэўнены, што Вы будзеце такім-жа няўхільным барацьбітом на адказнейшай пасадзе кіраўніка ўраду за выкананьне другой пяцігодкі.

Старшыня бюро Магілёўскай сэкцыі нав. працаўнікоў КАПАЕВІЧ.
Сакратар—ЧЭБАРТ.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

7-га мая 1932 г. спаўняецца 5 гадоў з часу абраньня тав. Галадзеда Мікалая Мацьвеевіча, на пасаду Старшыні Савету Народных Камісараў БССР.

Праз вялізарны гістарычны этап прайшла за гэты час Савецкая Беларусь.

Тав. Галадзед стаў на чале Савету Народных Камісараў у час завяршэньня аднаўленчага і ў пачатку рэканструкцыйнага пэрыяду народнай гаспадаркі БССР. Рабочая клясa і ўсе працоўныя масы БССР, пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дзякуючы нябываламу творчаму энтузіязму рабочай клясы і калгаснаму штодзённаму бальшавіцкаму кіраўніцтву сацыялістычным будаўніцтвам з боку Савету Народных Камісараў на чале з яго старшынёю тав. Галадзедам пасьпяхова завяршаць вычананьне першай пяцігодкі, у кіраўніцтве складаньнем якой тав. Галадзед прымаў беспасрэдны і актыўны ўдзел і ператварылі БССР з краіны дробнай, саматужнай прамысловасьці і раздробленай сельскай гаспадаркі ў краіну з вялікімі фабрыкамі і заводамі і з хутка разгортваючайся сацыялістычнай сельскай гаспадаркай.

Правільнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, імпаркія тэмпы культурнага будаўніцтва забясьпечылі вялізарныя посьпехі культурнай рэвалюцыі і далі магчымасьць ператварыць адсталую краіну былой царскай Расіі ў краіну сусьветнай пісьменнасьці з шырока разгорнутай сеткай вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць пралетарскія кадры для сацыялістычнага будаўніцтва.

Пасьпяховая работа Савету Народных Камісараў БССР самым неразрыўным чынам зьвязана з бальшавіцкай вытрыманасьцю, непрыхіхмай барацьбой супроць усякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі, супроць ухілаў ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, з няўтомнай энэргіяй, умелым таленавітым кіраўніцтвам і арганізацыйнымі здольнасьцямі тав. Галадзеда.

Тав. Галадзед зьяўляецца адным з лепшых бальшавікоў-ленінцаў і чуткім адзыўчывым бальшавіком-таварышам.

Адзначаючы з асаблівым задаволеньнем пяцігадовае прабываньне т. Галадзеда на пасадзе Старшыні Савету Народных Камісараў, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР упэўнены ў тым, што тав. Галадзед будзе і на далей пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і яе ЦК з той-жа бальшавіцкай энэргіяй працягваць сваю работу па далейшым разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва і беспасрэдным кіраўніцтве выкананьнем вялізарных гістарычных задач, пастаўленых на другую пяцігодку.,

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. Старшыні Савету народных камісараў БССР Г. ГРЫСЕВІЧ.

Сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

6-га мая 1932 г.
г. Менск.

Тав. Галадзеду Мікалаю Мацьвеевічу

Паважаны Мікалай Матвеевіч!

Дзяржаўны Вучоны Савет, сабраўшыся на першую Сэсію, шчыра вітае Вас у дзень Вашага пяцігадовага знаходжаньня на пасадзе Старшыні Савету Народных Камісараў БССР.

Пры Вашым актыўным удзеле пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, Савецкая Беларусь, як непадзельная частка СССР дасягнула вялізарнейшых посьпехаў па ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы вітаем у Вашай асобе аднаго з лепшых барацьбітоў за культурную рэвалюцыю, аднаго з кіраўнікоў будаўніцтва нашай беларускай нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце культуры.

Загартаваны бальшавік, вытрыманы ленінец, Вы няўхільна змагаецеся за генэральную лінію партыі на ўсіх участках нашага сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і на фронце культурнага будаўніцтва.

Пытаньні навукі, пытаньні асьветы, школы нязьменна знаходзяць з Вашага боку вялікую ўвагу і зацікаўленасьць.

Вашы даклады і выступленьні на сходах навуковых працаўнікаў і асьветнікаў значна дапамагалі вырашэньню пытаньняў культурнай рэвалюцыі у адносінах да іх і ленінскай лініі.

Дазвольце, дарагі Мікалай Мацьвеевіч, яшчэ раз ад імя Дзяржаўнага Вучонага Савету парадаць Вам шчырае прывітаньне і выказаць упэўненасьць у тым, што Вы і ў далейшай Вашай самаадданай працы за справу пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, таксама будзеце няпрымірымым барацьбітом за генэральную лінію партыі, будзеце у першых радох КП(б)Б, на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Перадаць Вам гэтае прывітаньне Пленум Дзяржаўнага Вучонага Савету даручае дэлегацыі у складзе заслужанага дзеяча навукі Гаусмана, праф. Шлітэра, настаўніцы Шафаловіч, тав. Рудніцкага і тав. Сермяжка.

Ад імя Першай Сэсіі Дзяржаўнага Вучонага Савету Акадэмік
ВОЛЬФСОН

ТАВАРЫШ ГАЛАДЗЕД!

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР, ад імя паўмільёна працоўных, аб'яднаных у радах Т-ва, шле табе стойкаму бальшавіку, змагару за сацыялістычнае будаўніцтва нашае краіны, у дзень 5-ці гадовага юбілею на пасадзе Старшыні савету народных камісараў Беларускай савецкай сацыялістычнай рэспублікі, шчырае гарачае прывітаньне.

Асоавіяхімаўцы разам з гэтым адзначаюць і амаль пяцігадовую работу тваю на пасту Старшыні Цэнтральнага Савету, за які час, дзякуючы праўільнаму кіраўніцтву, арганізацыя з некалькі дзесяткаў тысяч вырасла ў паўмільённую моцную арганізацыю.

Цэнтральны Савет ўпэўнены ў тым, што ты і надалей будзеш адным з першых бальшавікоў нашае камуністычнае партыі, будзеш упарта змагацца за хутчэйшую пабудову сацыялізму і ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны Саветаў. Твой актыўны ўдзел у кіраўніцтве дасьць магчымасьць Савецкай Беларусі і надалей мець перамогі на ўсіх вучастках сацбудаўніцтва і насіленьня абароны СССР.

Шчыра жадаем табе шмат гадоў здароўя, энэргіі і сіл у барацьбе партыі ў тваёй рабоце па будаўніцтву Сацыялістычнай Дзяржавы.

Цэнтральны савет Асоавіяхіму БССР.

Дняпро пайшоў па правадох

Т.т. Сталіну, Молатаву, Орджанікідзе, Калініну, „Правде"

КІЧКАС. Першага мая а 6 гадзі е 30 мін. увечары ад першага генэратара Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі дадзены прамысловы ток. Узятае на сябе абавязацельства перад партыяй і ўрадам калектыў Днепрабуду выканаў

Начальнік будаўніцтва А. ВІНТЭР
Сакрагар партыйнага камітэту ЛІБЭНЗОН
Старшыня райкому будаўнікоў БРОЎКА

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ІТС

адчыняецца 7 мая а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе імя Сталіна (інтэрнацыянальная вул.)

Паседжаньне фракцыі зьезду адбудзецца 7 мая а 5 гадзіне ўвечары ў залі паседжаньняў ЦСПСБ (Дом Працы, другі паверх, пакой № 10)

Выдача мандатаў праводзіцца, пачынаючы з 5-га мая з 9 да 4 гадз. дню і з 5 да 10 гадз. увечары у памяшканьні Бел. МБІТ'А (Дом Працы, другі паверх, пакой № 8).

Запрашальныя білеты гарадзкім сэкцыям ІТР выдаюцца ў Гар. МБІТ'е.

Арг. камісія зьезду

Па СССР

Харкаў. Трактарны

Дырэктару заводу Сьвістуну

ЦК УсеКП(б) вітае рабочых, работніц і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводу з нябывала хуткім асвоеньнем вытворчага працэсу і давядзеньнем вытворчасьці ў рэкордна-кароткі тэрмін да 100 трактараў у дзень.

ЦК УсеКП(б) спадзяецца, што калектыву заводу удасца ў некалькі месяцаў аўладаць поўнаю праектнаю магутнасьцю і потым паставіць сябе задачу аб перавыкананьні і праграмы

ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1) Увайсьці ў прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР аб узнагародзе ордэнам Леніна як заводу цалкам, так і асобных кіраўнікоў і ўдарнікаў;

2) Устанавіць пры заводзе дошку гонару з абазначэньнем імён і прозьвішч арганізатараў будаўніцтва заводу.

ЦК УсеКП(б).

Харкаўскі турбагенэратарны завод уступіў у пускавы пэрыяд

ХАРКАЎ (ТАСС). У паказаны партыяй і ўрадам тэрмін—1 мая—у асноўным скончаны будаўніцтва і мантаж Харкаўскага турбагенэратарнага заводу. Завод уступіў у пускавы пэрыяд.

Турбагенэратарны завод пабудаваны на аснове апошніх дасягненьняў сусьветнай тэхнікі. Жалеза-бэтоннаму корпусу заводу няма роўнага ў сьвеце: даўжыня яго—329 мэтраў, шырыні—89 мэтраў, вышыня 32 мэтра. Ён займае плошчу ў 45.300 кв. мэтраў, а кубатура—адзін мільён кубамэтраў. Пракладзены над'язныя шляхі для 35 кранаў, у тым ліку для аднаго 200 тонага. 570 станкоў устанаўляюцца у першым корпусе, сярод іх такарныя, стругальныя і фрэзэрныя станкі, здольныя апрацаваць ротар дзіной у 12,3 мэтра. Змантаваны цахі: ланцэтачны, цэх розных дэталяй, пліт і шчытоў, штамповачны і струмантальны.

Харкаўскі турбагенэратарны завод дасьць у год пры трохзьменнай вытворчасьці турбагенэратары агульнай магутнасьцю ў 2300 тыс. клв. Гэта раўняецца 45 проц. усёй вытворчасьці турбін у СССР і 66 проц. запатрэбаваньня апошняга году другой пяцігодкі.

Пушчаны буйнейшы ў сьвеце завод электразварачных машын

ЛЕНІНГРАД. На заводзе «Электрык» уступіў у эксплёатацыю новы электразварачны корпус, які зьяўляецца самым вялікім у сьвеце прадпрыемствам па вытворчасьці электразварачных машын і апаратуры.

У гэтым годзе новы цэх «Электрыка» выпусьціць 10.000 зварачных апаратаў і машын, г. зн. больш, чым усе прадпрыемствы падобнага тыпу ва ўсім сьвеце.

У канцы году завод прыступіць да вытворчасьці машын для згортваньня, зваркі, каліброўкі і разрэзкі труб; вытворчасьць кожнай машыны—да і кілёмэтра труб у час. Ва ўсім сьвеце ёсьць усяго толькі 6 такіх машын. Завод «Электрык» яшчэ ў гэтым годзе зрабіў іх 3 штукі.

Заводам будуць таксама выпушчаны першыя аўтаматычныя апараты для дугавой зваркі з дапамогаю вугалю і мэталю. Ва ўсім сьвеце ёсьць усяго толькі 12 такіх апаратаў. («Правда»).

БЯРЭЗЬНІКАЎСКІ ХІМКАМБІНАТ

БЯРЭЗЬНІКІ. Сёньня ўступіў у строй другі атрэгат сьнтэзу. У 9 гадз. 30 мін. раніцой трэцяя калёна выдала аміяк нармальнага саставу.

На пушчаным нядаўна азотнакіслотным заводзе працэс праходзіць нармальна. Крэпасьць азотнай кіслаты дасягнула 45 проц. Завод гатоў уступіць у прамысловую эксплёатацыю.

Работа заводу сернай кіслаты праходзіць пасьпяхова. 1-га мая завод поўнасьцю асвоіў праектную магутнасьць.

Прыкметныя якасныя зрухі адбыліся за апошнія дні на цэплаэлектрацэнтралі. 2 каты працуюць бесьперапынна.

Апошні завод азотна-тукавой групы гатоў к пуску. («Правда»).

Тагільская домна № 1 дала першы ванадыёвы чыгун

НІЖНІ ТАГІЛЬ. Домна № 1 Тагільскага мэталюргічнага заводу дала першыя 300 тон ванадыевага чыгуну. Колькасьць ванадыю ў чыгуне—0,4 проц. Ёсьць усе падставы чакаць пры 100 процентным уводзе ў шыхту тытана-магнэтаў 0,8—0,9 проц. ванадыю ў чыгуне замест тэарэтычна разьлічаных 0,6 проц. («Правда»).

Пушчана другая ў СССР брыкетная фабрыка

ЕНАКІЕВА. На рудні «Юны камунар» пабудавана другая ў СССР брыкетная фабрыка вытворчасьцю 240 тон вугальнага брыкету ў суткі. Па сваёй калёрыйнасьці брыкет равен добраякасному вугалю. «Правда»

Упарта змагацца за ўшчыльненьне тэрмінаў сяўбы

баявая задача кожнай брыгады

Жлобінская партарганізацыя абавязана неадкладна ліквідаваць прарывы

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Раён уступіў у пэрыяд разгортваньня масавай сяўбы. З 12-га красавіка з кожным днём у сяўбу ўступаюць усё новыя і новыя калгасы і аднаасобныя гаспадаркі. Пачалі сяўбу раньняй бульбы, яравога жыта, ячменю і вікі, калгасы «Новае жыцьцё», «Чырвоная ніва», «Астровак», «Прагрэс», «Расьсьвет-пераможца», 10 калгасаў і аднаасобны сэктар Папаратнянскага сельсавету.

Але трэба з усёй катэгарычнасьцю заявіць, што раён сяўбу спазьніў непадрыхтаваным. Важнейшае мерапрыемства, якое забясьпечвае выкананьне плянаў сяўбы—засыпка насеньня па рашаючых культурах знаходзіцца ў наступным становішчы: насеньне буль бы засыпана толькі на **69,3 проц.**, тэхнічных на **65,3 процантаў**, збожжавых — на **82,3 проц.**, вікі— на **31,2 проц.** В. Асебінскі сельсавет, які прыступіў ужо да сяўбы насеньнем, забясьпечан на 34 проц., Дабрагашчанскі сельсавет—на 64,2 проц. Мацевіцкі сельсавет—на 46 проц. і г. д.

Пачын перадавых калгасаў па стварэньні фонду насеннай узаемадапамогі не падхопілены раёнам, рэалізацыя насеннай пазыкі ідзе зусім незадавальняючымі тэмпамі, без кіраўніцтва гэтай работай мясцовымі парт'ячэйкамі і сельсаветамі. У сувязі з разгортваньнем сяўбы на мясцох маюцца яўна дэмабілізацыйныя настроі, у выніку якіх за апошнюю пяцідзёнку ніякага прыросту ў засыпцы насеньня няма.

Генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы правалена. Праўда мабілізавалі і паслалі на раён шмат працаўнікоў, але ніхто не праверыў сапраўдны выезд на раён мабілізаваных і вынікі праведзенай імі работы.

МТС да сяўбы не гатова. З 47 калгасаў у раёне яе дзейнасьці брыгады арганізаваны толькі ў 22 калгасах. Ні якай работы, якая-б замацавала выні кі арганізацыі брыгад не праведзена, у прыватнасьці курсы брыгадзіраў не створаны. Будаўніцтва МТС праходзіць недапушчальна марудна.

Яўна ігнаруюцца ў раёне дырэктывы партыі аб падвышэньні ўраджайнасьці. Зернаачышчаньне праведзена толькі на 56,3 проц. Радковымі сеялкамі калгасы не забясьпечаны, а склады райсельгаснабу імі завалены, як і іншымі машынамі. Саўгас імя Гея ня ўлічыўшы ўрокаў мінулага году, калі пры сяўбе ў аднавор ён апрымаў ураджай з га аўса 2 цнт., выехаў і ў гэтым годзе сеяць бульбу ў аднавор.

Асабліва недапушчальныя апартуністычныя адносіны раённых і мясцовых арганізацый наглядаюцца да аднаасобнага сэктару, ня гледзячы на тое, што раён калектывізаваны толькі на 30 проц. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі Кабанаўскага, Казіміраўскага і інш. сельсаветаў яшчэ ня ведаюць, дзе яны будуць сеяць. 9 сельсаветаў з 23 не давялі плянаў да паасобных паселішчаў, 7 сельсаветамі не даведзены цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных гаспадарак. Заданьні аб пасевах беднякам і сераднякам у парадку самаабавязацельстваў яшчэ толькі друкуюцца ў райза, у той час, калі ўжо сяўба пачалася. Страхфонды засыпаны аднаасобнікамі на 11 проц.

Становішча з разгортваньнем сяўбы ў раёне вельмі пагражаючае. Апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай кампаніяй адсутнічае. Патрэбны тэрміновыя і рашучыя меры.

Патрэбна мабілізацыя ўсіх сіл, арганізацыя грамадзкага буксіру з боку перадавікоў (Майскі, Кіровіцкі, Чэцьвернянскі, Радушскі і інш сельсаветы), якія сустрэлі вясну па-бальшавіцку. Ударыць па дэмабілізацыйных настроях. Апэрацыйна і канкрэтна кіраваць важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй—сяўбой.

Закрэўскі.

Пытаньні мэханізацыі апрацоўкі глебы пры пасеве лёну

(Аддзел кансультацыі)

У сучасны момант набывае асаблівую важнасьць пытаньне падбору сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару для спэцыялізаваных лёнаводных сацыялістычных гаспадарак. Для лёнаводных раёнаў гэта пытаньне мае выключна актуальнае значэньне.

Выходзячы з таго, што лён у першы пэрыяд свайго росту разьвіваецца вельмі слаба ёсьць небясьпека, што сьмяцьцёвыя расьліны могуць яго заглушыць. Вось чаму жаксьць апрацоўкі глебы набывае асабліва важнае значэньне пры пасеве такой працаёмкай культуры як лён. Гэта мае яшчэ і тое значэньне, што ў сувязі з больш дасканалай апрацоўкай глебы значна скарачаецца работа па помпы.

Выходзячы з севазваротных умоў, ці характару глебы асвоенай пад лён, прылады па апрацоўцы глебы павінны па сваім прызначэньні адпавядаць умовам апрацоўкі больш зьвязаных глебаў. Улічваючы гэта плугі павінны абірацца з паўпрубовымі адвалам. Паўпрубовы адвал дае даволі добры зварот пласта з некаторым драбленьнем. Калі апрацоўваемая глеба мае значны зернавы пласт, дык станоўчыя вынікі дае плуг з прадплужнікам (дзёрназдымам). У даным выпадку спачатку здымаецца дзернавы пласт і скідаецца на дно баразны. Пасьля гэтага ён закрываецца астатняй часткай пласта, які распрацоўвае адвал плуга.

Пры распрацоўцы бросавых земляў, дзе ёсьць у наяўнасьці карэньні, якія перашкаджаюць рабоце звычайнага лямешнага плута (таму што такі плуг нават пры наяўнасьці адпаведнай магутнасьці рухавіка будзе заклінівацца і дрэнна дзейнічаць на пласт), трэба пускаць дыскавыя плугі, дзе рабочай часткай зьяўляецца загнуты дыск, як у дзіскавым культыватары. Пры карыстаньні звычайных лямешных плугам вельмі патрэбна ставіць перад адвалам дыскавы нож, а не чаранковы.

Для нармальнай працы плуга патрэбна каб паверхня лямяша і адвалу плаўна пераходзілі адна да аднэй. Таксама трэба сачыць за тым, каб на паверхні ня было іржы, або фарбы. Не зрабіўшы гэтага адвал у часе працы будзе заліпаць і ўплыў на пласт глебы значна пагоршыцца. Вось чаму ўсе часткі плуга, якія трудца абавязкова павінны змазвацца.

Пасьляплужная апрацоўка глебы ў выніку якой павінен быць створаны добра разрыхлены пласт зьяўляецца вельмі важным момантам для нармальнага пасеву і росту лёну.

У даным выпадку работу па разрыхленьні пласта павінен выконваць галоўным чынам дыскавы культыватар, які сваімі дыскамі расьціскае глебу, што спрыяе лепшаму драбленьню. Пасьля работы культыватараў глеба яшчэ ня мае зьлітнай паверхні, што неабходна для пасеву і таму паверхновая яе разьдзелка павінна займаць пэўнае месца ў прадпасеўнай апрацоўцы. Гэту работу можна выконваць баронамі, ці пружыннымі культыватарамі ўстаноўленымі на неглыбокую глыбіну. Пры гэтым лапы пружынных культыватараў павінны быць пастаўлены як мага бліжэй адна ад аднэй па шырыні культыватара.

Да гэтага часу практыкаваўся раскіданы пасеў лёну, які ня зусім адпавядае запатрабаваньням нармальнага росту расьліны і таму патрэбна пераходзіць на радковы пасеў. Для радковага пасеву, паколькі цяпер яшчэ няма стала выпрацаванай радковай лёвай сеялкі, можна скарыстоўваць звычайныя радковыя сеялкі. Шырыня міжрадзьдзя павінна быць 8—10 см., а ў некаторых выпадках дапушчальна і 15 см.

Абіраючы вялічыню міжрадзьдзя трэба памятаць аб магчымасьці мэхалізаваць прыёмы па дагляду за расьлінамі ў часе росту. Для радковага пасеву лепш карыстацца сеялкай з тупакутнымі (эўрапэйскімі) сашнікамі, якія не імкнуцца паглыбляцца ў глебу і паколькі ў такіх сеялках сашнікі пастаўлены ў два рады, яны будуць значна лепш забіваць.

І. П. Антонаў.

Прамысловасьць пачынае адчуваць прарыў у загатоўках скурсыравіны

Ударыць па кадушніку і спэкулянту, якія зьнішчаюць каштоўную сыравіну для скуранай прамысловасьці

ПРАРЫЎ ПАГЛЫБІЎСЯ

Прарыў у скуразагатоўках, які стварыўся ў першым квартале г. г., яшчэ больш паглыбіўся ў красавіку, асабліва па дробнай сыравіне, для якой гэты пэрыяд зьяўляецца сэзонным.

За 20 дзён красавіка месячны плян выкананы па буйных скурах на 55,9 проц., дробных 37,8 проц., сьвіных—25,1 проц. і сабачых—на 28,6 проц.

Загатоўка апойкаў (цялячых скур) складае толькі—30-35 проц. адпаведнага паступлення мінулага году, так сама каляндарны плян на 20 красавіка выкананы ўсяго на 30 проц.

Гэтае становішча тлумачыцца тым, што загатоўчы апарат, у асаблівасьці спажывецкай кааперацыі, працуе нела сталкова. Абслугоўваньне глыбінных вясковых рынкаў не забясьпечана падворнай зборкай, таксама зусім не разгорнуты грамадзкія мэтады загатовак (калектыўныя здачы, чырвоныя пароскі і г. д.).

Асяданьне скурсыравіны, затрымка яе ў калгасах і саўгасах для ўласнага спажываньня носіць масавы характар. Аб гэтым паведамляюць з раду раёнаў.

У Клімавіцкім раёне калгасы «Энэргія», «3-ці інтэрнацыянал» і іншыя самастойна выраблялі буйную скурсыравіну для ўласных патрэб. У Лоеўскім раёне наглядаецца такое-ж зьявішча, пры чым некаторыя калгасы ня толькі затрымліваюць сыравіну, але часам самі скупляюць яе для пераапрацоўкі.

Наконт гэтага праўленьне калгасу «Прамень камуны» з Старобінскага раёну гаварыла:

— Мы ўсёроўна купляем збрую ў кааперацыі, дык навошта здаваць скуры, калі мы самі вырабім.

Наглядаліся выпадкі, калі калгасы здавалі для апрацоўкі скурсыравіну кадушнікам.

Факты сьведчаць аб тым, што барацьба з кадушнікамі недастаткова разгорнута. У Чаўскім раёне ляжаць чатыры справы аб выкрытых кадушніках, дзьве з іх спынены біз выніку, пры чым адзін кадушнік апраўданы зусім па невядомых прычынах.

Мясцовыя арганізацыі не аддаюць належнай увагі загатоўкам скурсыравіны, не патрабуюць адказнасьці ад сельсаветаў і загатоўчага апарату за выкананьне плянавых заданьняў.

У Вушацкім раёне загатоўчы пункт Саюзскурэ амаль заўсёды бывае на замку. Не адстае ад яго і райспажыўсаюз. У Кармянскім раёне загатоўкай скурсыравіны зусім ня цікавяцца, ня цікавяцца, у прыватнасьці, загадчык загатпункту. Загатоўка сьвіных скур у раёне сарвана зусім.

І ў гэты-ж час частка прадпрыемстваў па пераапрацоўцы скуранай сыравіны працуе ў вельмі напружаных умовах. Ясна адно, што мы ня можам цярпець прарываў у выкананьні загатоўчых плянаў і што заводы ні ў якім разе ня могуць цярпець недахопу ў сыравіне.

Для ліквідацыі прарываў у загатоўцы павінна быць мабілізавана ўся грамадзкасьць і, ў першую чаргу, загатоўчыя органы. Праз шырокае разгортваньне масавай работы вакол загатовак трэба дабіцца пералому. Асабліва шмат увагі павінен аддаць гэтай справе друк, які павінен уключыцца ў арганізацыю масавай работы.

Дырэктывы партыйных і савецкіх органаў аб забясьпечаньні скурсыравінай патрабуюць неадкладнага выкананьня. Пытаньне скуразагатовак павінна стаць у цэнтр усіх мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Канкрэтныя мерапрыемствы па далейшым разгортваньні масава-апарацыйнай работы ў самы бліжэйшы час варта было-б абгаварыць на сумесным пасяджэньні арганізацый заводу «Бальшавік» і загатоўчых арганізацый гораду і раёну.

Хамелянскі і Лапін.

ЗА АСМОЛКУ СЬВІНЫХ СКУР--ДА АДКАЗНАСЬЦІ

МСЬЦІСЛАЎ. (Наш. спэцкор). Загатоўчым пунктам Беларускай канторы трэсту «Саюзскур» наогул плян загатоўкі скурсыравіны за 1 квартал гэтага году перавыкананы. Скур буйнай рагатай жывёлы трэба было павод ле пляну загатовіць 175, загатоўлена—177; дробнай—750, загатоўлена—1031. Сьвіных скур замест 330, загатоўлена 750 шт. Па салатоўцы за гэты-ж пэрыяд часу атрымана каля 8 тон тлушчу.

Трэба адзначыць, што з талачынскага заводу «Прамкамбінат» паступаюць для абмену на сыравіну аўчыны дрэннай якасьці.

Слаба дапамагае загатоўкам скур сыравіны на раёне мсьціслаўскі райспажыўсаюз. Замест таго, каб дапамагчы сельсавету і калгасам у іх загатоўчай рабоце райспажыўсаюз займаецца загатоўкай выключна ў самым горадзе, які абслугоўваецца іншымі загатоўчымі арганізацыямі («Саюзскур», «Белпушніна» і інш.)

У раёне вельмі распаўсюджаны выпадкі самавольнай асмолкі сьвіных скур, а таксама кадушніцтва (незаконная засолка скур) смялець забітых сьвіней нават адказныя работнікі, члены партыі (дыректар вінбровару Молчч, вінакур Ліпкін, супрацоўнік РВК Шасьцітка і інш.)

Рэагаваньне з боку міліцыі на гэтыя абуравочыя факты—часам жартоўнае. Штрафы ў 5—10 руб. вельмі часта не дасягаюць мэты і не спыняюць драпежніцкага разбазараваньня скурсыравіны.

Рад сельсаветаў злачынна нядбайна адносяцца да гэтай справы (Курманоўскі, Татаршчынскі сельсаветы); у гэтых сельсаветах самі кіруючыя работнікі пакрываюць асмольшчыкаў і кадушачнікаў.

Неабходна рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы бесьперабойнага забясьпечаньня сацыялістычнай прамысловасьці скурсыравінай.

Юр. Лявонны.

Рашучая і сыстэматычная барацьба

з коснасьцю, бюракратызмам, цяганінай у нашых апаратах зьяўляецца аднэй з істотных задач партыі і рабочае клясы (СТАЛІН)

Работу бюро скарг на ўзровень задач сацбудаўніцтва

Папярэднія вынікі пяцідзёньніка праверкі работы бюро скаргаў паказваюць, што ня ўсе кантрольныя органы і бюро скаргаў перабудавалі сваю работу так, каб хутчэй рэагаваць на скаргі.

Мы маем недапушчальныя факты, калі скаргі, якія паступаюць ад працоўных у кантрольныя органы і бюро скаргаў мэханічна перадаваліся ў тыя органы, на якіх гэтыя скаргі паданы, скаргі месяцамі залежваюцца без разбору (Жлобін і Гомель).

Ня ўсё яшчэ зроблена ў справе аказаньня дапамогі органам РСІ і бюро скаргаў з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый.

У радзе месц зусім адсутнічае дапамога пастом і рабочым заседацелям РСІ з боку фабрычна-заводзкіх арганізацый (Жлобін, Слуцак, Гомель).

Ператварыць бюро скаргаў у сапраўдныя сігналізатараў партыі і ўраду аб фактычным ходзе выкананьня іх дырэктыў і пастаноў, у жыць «разнастайныя формы і спосабы кантролю зьнізу, каб паралізаваць усякую цень магчымасьці скажэньня савецкай улады, каб вырываць паўторна і нясупынна сорную траву бюракратызму» (Ленін). Такавы задачы партыйных і прафсаюзных арганізацый нашых прадпрыемстваў у сваёй штодзённай рабоце. Штодзённая дапамога, узмацненьне бюро скаргаў лепшымі ўдарнікамі фабрык і заводаў, стварэньне вакол РСІ сталага актыву—забясьпечыць органам РСІ і бюро скаргаў магчымасьць стаць вострай зброяй ў барацьбе з бюракратызмам і коснасьцю ў нашым апараце.

Гомельшчына павінна ліквідаваць недахопы

ГОМЕЛЬ. Бюро скаргаў пры РСІ побач з некаторымі дасягненьнямі мае рад буйных недахопаў. У рабоце адсутнічае апэрацыйнасьць, няма аправеркі выкананьня пастаноў, адсутнічае масавая работа. Рэагаваньне на скаргі марудненае. Скаргі залежваюцца. Такіх, што праляжалі тыдзень—47, два тыдні—20, тры тыдні—9, месяц—6 і г. д.

Аб наяўнасьці цяганіны ў Бюро скаргаў сьведчаць наступныя факты: рабочым заводу «Рухавік рэвалюцыі» падалі заяву аб тым, на набудову інтэрнату перадыдаткавана 16.000 руб. і што інтэрнат для жыльля нягодны. У скарге зазначалася на затрымку будаўніцтва. Гэтая скарга, паданая месяц таму назад, яшчэ і да гэтуль ляжыць бяз руху.

Ня вуліцы Камунараў, у кватэры рабочага Каліроўскага працякала столь, аб гэтым была падана скарга. Бюро прапанавала Жыласоюзу прыняць адпаведныя меры, але апошні гэтай прапановы ня выканаў. Дайшло да таго, што столь правалілася. Каліроўскі зноў падаў заяву, якая разглядалася на працягу 2-х тыдняў.

(Белта).

У барацьбе за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі

ШКЛОЎ. Сэкцыя РСІ пры Падгайцаўскім сельсавеце пераключыла ўсю сваю работу на канкрэтнае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых пяцідзёньнікам.

Бюро скаргаў складаецца пераважна з калгасьнікаў і ўвесь струмень яго працы накіраваны на ажыцьцяўленьне пастаноў партыі, на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Сэкцыя РСІ таксама ўключылася ва ўсебеларускую праверку падрыхтаванасьці да сяўбы. Усе гаспадарча-палітычныя кампаніі ў Падгайцаўскім сельсавеце праходзілі пры актыўным удзеле сэкцыі.

Разгорнута масавая работа па вярбоўцы актыву з калгасьнікаў для дапамогі рабоце бюро скаргаў.

Брыгада газэты «Савецкая Беларусь»: Ярсні, Плешчаўсні.

За палепшаньне якасьці скурсыравіны

Барацьба з аваднём

Якасьць сыравіны ў большасьці залежыць ад таго, наколькі работнікі, што маюць адносіны да сыравіны, знаёмы з прадзабойным утрыманьнем жывёлы, правіламі забою, кансэрвіроўкай, хаваньнем скур і г. д. Паніжэньне якасьці сыравіны скарачае выхад добраякасных тавараў, патражае выкананьню пяцігадовага пляну па выпуску абутку.

Неабходна, каб ўсе загатоўчыя арганізацыі, якія маюць дачыненьне да жывёлы, тэрмінова зрушылі сваю работу па якасьці скурсыравіны з мёртвай кропкі і ў асаблівасьці ў барацьбе з аваднём—бічом нашай жывёлагадоўлі. Лічынка авадня трапіць у жывёлу, прасьвідроўвае скуру і зьніжае яе кошт прыкладна на 50 проц. Жывёла марнее, хварэе, перастае даіцца, не нагульваецца і г. д. Паводле прыблізных падлікаў, страты народнай гаспадаркі ад аваднія дасягаюць на мясе, сале і малаку да 100 міл. руб. у год і на скурах 15—20 млн.

Неабходна зараз-жа, каб ня ўпусьціць сэзону, павесьці рашучую барацьбу з аваднем. Гэта барацьба павінна быць арганізавана цэлымі калгасамі, саўгасамі і лепш за ўсё цэлымі раёнамі. У гэтым у першую галаву павінен быць зацікаўлены НКЗем, Белкалгасцэнтр, Жывёлавод і інш. арганізацыі. Неабходна, каб быў створаны цэнтральны штаб па барацьбе з аваднём і гэты штаб павінен узяць пытаньне перад адпаведнымі арганізацыямі, дапамагаць у рабоце АБВ.

Арганізацыі, якія заключылі дагаворы з АБВ, павінны без затрыманьня ўнесьці належачыя з іх сумы, снабжэнчыя арганізацыі павінны забясьпечыць АБВ неабходнымі інструментамі, мэдыкамантамі і г. д. 1 толькі тады, калі ў гэту работу будзе ўцягнута ўся савецкая грамадзкасьць, мы дабіцемся жаданых посьпехаў у барацьбе за якасьць скурсыравіны.

Упаўнаважаны дзяржаўнай інспэкцыі па якасьці сыравіны Вайнэр

Аб бліжэйшых задачах фінансавай работы

А. Хацкевіч

Фінансавая сыстэма Савецкай Беларусі пры, актыўным удзеле грамадзкасьці гораду і вёскі, пад непасрэдным кіраўніцтвам КП(б)Б дабіліся вялізарных посьпехаў на фінансавым фронце. БССР выканала фінплян чацьвертага кварталу мінулага году і перавыканала заданьне па мабілізацыі сродкаў у першым квартале бягучага году, заваяваўшы першае месца сярод рэспублік і атрымала пераходзячы чырвоны сьцяг СССР. Мы дабіліся больш-менш рэгулярнага, сыстэматычнага фінансіраваньня патрэб і мерапрыемстваў па разьвіцьці свячасовай выдачы заработнай планароднай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, поўнай, бесьперабойнай і ты, як па бюджэту, так і па фінпляну ў цэлым.

Гэтыя факты вялізарнай палітычнай і гаспадарчай важнасьці самі за сябе гавораць аб тэмпах і якасьці працы фінансава - крэдытнай сыстэмы Беларускай ССР.

Аднак, было-б няправільным і нават шкодным думаць, што на фінансавым фронце ў нас ўсё добра і што можна задаводніца дасягнутымі посьпехамі. Наадварот, каб забясьпечыць замацаваньне дасягнутых посьпехаў і дабіцца ва ўсіх галінах саспраўды здавальняючага становішча, неабходна ў парадку крытыкі і самакрытыкі выкрыць і прызнаць слабыя месцы, свячасова намеціць неабходные мерапрыемствы палепшаньня справы, узмацненьня тэмпаў і палепшаньня якасьці працы ўсяго фінансава-крэдытнага апарату. Перш за ўсё, у справе мабілізацыі сродкаў, поруч з перавыкананьнем агульнага - рэспубліканскага пляну мы маем рад адстаючых вучасткаў: значны недабор сродкаў па плянах пазыкі, ашчадсправы, пазвых накапленьняхі кааперацыі, рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і г. д.

Поруч са значным перавыкананьнем плянаў па мабілізацыі сродкаў перадавымі гарадамі і раёнамі БССР, мы маем апартуністычны самацёк па раду раёнаў і арганізацый. Яшчэ далёка ня ўсе раёны, саветы, фінансавыя і гаспадарчыя арганізацыі зразумелі палітычную і гаспадарчую важнасьць справы мабілізацыі сродкаў і тое, што без выканаўня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцявіць народнагаспадарчы плян сацыялістычнага будаўніцтва. У значнай частцы сельсаветаў камсоды і ашчадкасы бязьдзейнічаюць, дапушчаюць адлівы ўкладаў з ашчаджас, правальваюць справу мабілізацыі сродкаў на вёсцы.

Установлены інстытут намесьнікаў старшынь сельсаветаў з вызначэньнем адпаведнай стаўкі спэцыяльна для фінансавай работы, выкананьня сельбюджэтаў і мабілізацыі сродкаў насельніцтва, на справе амаль не існуе. Рахункаводы, што ёсьць пры некаторай частцы сельсаветаў займаюцца галоўным чынам зьбіраньнем вестак па ўсіх галінах працы, ператвараючыся ў звычайнага статыстыка. Такія зьявішчы гаворыць аб недаацэнцы некаторымі раёнамі справы фінансавага фронту, аб слабасьці працы і барацьбы раённых фінансавых органаў, за кадры, за выкананьне фінпляну. Як характарызаваць працу Бешанковіцкага, Будакашалеўскага, Веткаўскага, Сеньненскага, Хойніцкага, Прапойскага, Расонскага, Старадорскага, Чаўскага, Сураскага, Крупскага і Крычаўскага раёнаў, калі ў адказ на дырэктывы партыі і ўраду аб датэрміновым выкананьні фінпляну, — даць да 1-га мая 50 проц. квартальнага заданьня, гэтыя раёны за май выканалі квартальныя заданьні менш чым на 25 проц.

Злачынна нядбайныя адносіны да сваёй непасрэднай справы з боку райфа, райашчадкас і райбанкаў адстаючых раёнаў, апартуністычная не дацэнэка кіраўніцтвамі гэтых раёнаў фінансавай справы прыводзяць да зрыву фінпляну. Гэтым раёнам ЦК КП(б)Б даў катэгарычнае папярэджаньне.

Пралетарская грамадзкасьць, партыйныя арганізацыі адстаючых раёнаў павінны ўзяць прыклады бальшавіцкай работы перадавых гарадоў і раёнаў — Менску, Гомелю, Бабруйскага, Тураўскага, Заслаўскага, Быхаўскага, Аршанскага, Старобінскага, Жыткавіцкага і Лепельскага, — якія выканалі звыш 50 проц. квартальнага заданьня да першага мая. Баявая задача ўсіх фінансавых органаў — выкарыстаць і поўнасьцю ажыцьцявіць апошнюю дырэктыву ЦК партыі аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва, аб датэрміновым, добраякасным выкананьні фінпляну. Трэба яшчэ больш разгарнуць масавую работу, сацспаборніцтва, ударніцтва сярод моладзі, жанчын, рабочых, калгасьнікаў, мабілізуючы ўсю грамазкасьць, усе працоўныя масы на выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. Асабліва гэта важна ў галіне добраахвотных плацяжоў: пазыка, ашчадсправа, паі кааперацыі, акцыі Трактарацэнтру, уцягненьне ўкладаў у фонд «сацыялістычнага чырвонцу», як новы мэтад мабілізацыі сродкаў, што прыняты на пачыну самых перадавых рабочых. Трэба яшчэ шырэй разгарнуць масавае сацспаборніцтва і ўдарніцтва за датэрміновае і добраякаснае выкананьне фінпляну.

Бальшавіцкія тэмпы працы, масавая работа на фронце мабілізацыі сродкаў павінны захаваць цьвёрдую кляса вую лінію ў дачыненьні да кулацка-нэпманскіх элемэнтаў, не дапусьціць перагібаў у дачыненьні серадняка, зьявішчаць ўсякія рэшткі прымусовага адміністраваньня ў добраахвотных плацяжох.

Работа фінансава - крэдытных органаў па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў будзе ацэньвацца выключна ў залежнасьці ад выкананьня дырэктыў указваючых на поўнае падсканае паступленьне сродкаў на ўсіх пляжох і наколькі мэтады працы адпавядалі дырэктыве аб разгортваньні масавай работы. Партыя вяла і будзе весьці на фінансавым фронце, рашучую барацьбу з правым апартуністам і «лявацкімі» заскокамі і перагібамі, з очкаўцірацельствам.

У справе налічэньня і спагнаньня плацяжоў з грамадзкаграм сэктару мы маем агідныя факты праяўленьня нэпманскіх рвацкіх тэндэнцый з боку паасобных прамысловых, гандлёвых і кааперацыйных арганізацый, што выяўляецца ва ўтойваньні вялічыні зваротаў і даходаў. Нават, ёсьць факты ўкрыцьця аб'ектаў падлягаючых падатковаму абкладаньню, часта пры папусьціцельстве і з вдама пізавых фінансавых органаў.

Раёны: Асіпавіцкі, Рагачэўскі, Лоеўскі, Стара-Дарожскі, Сененьскі, Кармянскі Дубровенскі выканалі заданьне першага кварталу па плацяжох з абагуленага сэктару менш чым на 30 проц.

Задача фінансавых органаў разам з грамадзкасьцю павесьці рашучую барацьбу за поўнае выяўленьне аб'ектаў, зваротаў, даходаў, поўнае і свая часовае паступленьне ўсіх плацяжоў з грамадзкага сэктару народнае гаспадаркі, прыцягваючы зрыўшчыкаў плацяжоў да грамадзкага ўдзейнічаньня, адміністрацыйнай і судовай адказнасьці.

Паасобныя вучасткі нашай прамысловасьці недавыконваюць заданьні па колькасных і асабліва па якасных паказьніках. Поруч з гэтым, мы маем факты недапушчальна марудна га ўкараненьня гаспадарчага разьліку ў паасобных зьвеньнях гаспадарчай і кааперацыйнай сыстэмы, адсутнасьці жорсткай эканоміі, няправільнага скарыстаньня крэдытаў, перавышэньня лімітаў, самачыннага перавыкананьня выдаткаў звыш зацьверджаных плянаў. Асабліва перавышаюцца выдаткі па капітальным будаўніцтве, дзе наглядаюцца масавыя факты значных перавыдаткаў па будматар'ялах, гужавым транспарце, заработнай плаце і факты адміністрацыйных выдаткаў, фактычнай аплаты прагулаў і безгаспадарчасьці.

Часта заключаюцца дагаворы на новае будаўніцтва без дастатковых сродкаў і будматар'ялаў, у выніку чаго будаўніцтва цягнецца гадамі і гадамі бяз карысьці, ляжаць замарожаныя матар'ялы і сродкі на мільёны рублёў з вялікай запазычанасьцю будаўнічым арганізацыям.

Для Камунбанка і Банку доўгатэрміновага крэдытаваньня тут непачаты край працы, вялізнае поле дзейнасьці.

Разгортваньне тавараабароту праходзіць марудным, ідзе нездавальняючымі тэмпамі. Недастаткова скарыстоўваюцца вялізарныя ўнутраныя рэсурсы, як і рацэй наглядаюцца факты замаражваньня тавараабароту, перавышэньня таварных астач супроць лімітаў на дзесяткі мільёнаў рублёў і гэта часта пры недахопу прамтавараў. Мы маем і такое, зусім недапушчальнае зьявішча, як невыкананьне дырэктыў партыі аб шырокім разгортваньні гандлёвай сеткі саўгаснага, калгаснага і саматужнага гандлю.

Усе гэтыя недахопы ў гаспадарчай кааперацыйна - гандлёвай дзейнасьці гавораць перш за ўсё аб слабасьці і недастаткова актыўнай рабоце фінансава-крэдытных органаў, якія яшчэ недастаткова глыбока залезьлі праз кантроль рублём у справу вытворчасьці, будаўніцтва, гандлю, тавараабароту — ва ўсю гаспадарча - эканамічную дзейнасьць краіны. У гэтым сэнсе фінансава-крэдытныя органы павінны рашуча перабудаваць сваю работу і разам з усёй пралетарскай грамадзкасьцю павесьці бязьлітасную барацьбу за ўкараненьне сапраўднага гаспадарчага разьліку, за эканомію ва ўсёй фінансава - эканамічнай дзейнасьці і будаўніцтве, за зьніжэньне сабекошту ў вытворчасьці і будаўніцтве, за павялічэньне тавараабароту, за стопроцантную, падэкадную мабілізацыю сродкаў насельніцтва поўнасьцю па ўсіх плацяжох. Неабходна ўстанавіць самы жорсткі кантроль рублём у адносінах да невыконваючых арганізацый і прадпрыемстваў, паставіўшы на справе выдачу грошай па фінпляну ? гаспадарча-кааперацыйных бюджэту і банкаўскаму крэдыту ў залежнасьці ад выкананьня пляну сацыялістычнага накапленьня і фінансавых абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай. У барацьбе за выкананьне і перавыкананьне фінпляну заключнага году пяцігодкі, фінансавая сыстэма, усе актывісты, ударнікі фінансавага фронту не павінны адступаць перад цяжкасьцямі клясавай барацьбы, барацьбы з бюракратызмам і апартуністам, і безгаспадарчасьцю паасобных гаспадарчых і кааперацыйных арганізацый. Наадварот, разам з пралетарскай грамадзкасьцю з усёй бальшавіцкай рашучасьцю наступаючы на ўсе прашкоды ў выкананьні фінансавага пляну, як асноўнага сродку паспяховага ажыцьцяўленьня ўсяго народна - гаспадарчага пляну, бо «сутнасьць бальшавіцкага наступленьня заключаецца далей у тым, каб мабілізаваць максымум сродкаў на справу фінансаваньня нашай індустрыі, фінансаваньня нашых саўгасаў і калгасаў» (Сталін). У прыватнасьці, неабходна прымусіць рублём нашу кааперацыю, гандлюючыя і прамысловыя органы выйсьці на рынак тавараабароту, даць поўны ход тавараабароту і шырокаму разгортваньню савецкага гандлю, як сродку палепшаньня рабочага забясьпечаньня.

Фінармейцы, увесь фінансавы актыў на фінансавым фронце, у барацьбе за перавыкананьне прыбытковай часткі фінпляну другога і трэцяга кварталаў павінны сябе праявіць як героі важнейшай справы, важнейшага вучастку і сацыялістычнага будаўніцтва заключнага году пяцігодкі.

Разам з гэтым, мы павінны дабіцца поўнага і мэтазгоднага скарыстаньня банкаўскага крэдыту наогул і асабліва крэдытаў і сродкаў на фінансіраваньне сельскай гаспадаркі. У гэтым годзе па розных каналах павінны ку БССР звыш 150 мільёнаў рублёў. Гэта вялізарная сума грошай, якая павінна пры добрай пастаноўцы крэдытаваньня і фінансіраваньня дапамагчы перш за ўсё вырашэньню галоўнейшых задач: арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў, падняцьцю ўраджайнасьці, разьвіцьцю жывёлагадоўлі і тэхкультур. Нажаль, на гэтую вельмі важную справу банкаўскі крэдыт скарыстаны за першы квартал гэтага году толькі на 45,6 проц., а па собных раёнах, як напрыклад: Пухавіцкім, Веткаўскім, Чэрвенскім, Чырвонапольскім, Крупскім, Бялынічскім, Касьцюковіцкім, Стара - Дарожскім, Лепельскім, Лагойскім, Бягомльскім, менш чым на 25 проц. Такое зьявішча можна тлумачыць толькі нядбайнасьцю земельна - калгасных органаў і перш за ўсё фінансава - крэдытнага апарату, драбленьнем крэдыту, кулацкай урачыстай, адсутнасьцю папулярызацыі дзяржаўнага крэдыту, «Ківаць» тут на аб'ектыўныя ўмовы, на розныя органы і арганізацыі—ня месца. Тут вінаваты і фінансава - крэдытныя органы. Фінансава-крэдытныя - органы, фінансавы актыў, ударнікі пры актыўным удзеле грамадзкасьці павінны дабіцца правільнага і свячасовага фінансіраваньня і крэдытаваньня ўсіх мерапрыемстваў сацыялістычнага будаўніцтва гораду і вёскі з максымальнай эканоміяй і рацыянальным скарыстаньнем народных сродкаў і рэсурсаў нашай краіны

Даць адпор апартуністычнай стаўцы на скарачэньне плянаў

Калгасу імя Леніна, Клінощкага с-с. (Чарвеньскі раён) па пляну райкалгасаюза трэба было засеяць гэтай вясной 10 га тэхкультур. Але чамусьці праўленьне калгасу плян райкалгасаюзу прызнала не рэальным, у той час, калі ў калгасе ёсьць усе магчымасьці для выкананьня.

Так, паводле пляну райкалгасаюза, неабходна засеяць лёну 7 га, прынята—5 га, канапель—2 га, прынята—1, бабовых культур вызначана 1 га, якіх праўленьне калгасу зусім ня прыняла.

Апроч гэтага плянам райкалгасаюза за прадугледжана 10 га веснавой распалкі (за лік цалины і залежаў), але калгасам зноў-такі прынята 1 га. Такім чынам, калгас імя Леніна прымае даведзеныя пляны, выходзячы з меркаваньняў праўленьня. Сельсавет-жа стаіць у тыле барацьбы за выкананьне пляну бальшавіцкай вясны і ніякай арганізацыйна-масавай работы не праводзіць.

Райкалгасаюз і сельсаветы павінны зараз-жа праверыць работу праўленьня калгасу, праверыць як калгас падрыхтаваны да сяўбы і па якіх прычынах ня прыняты плян засеву тэхкультур.

Ш. А.

Апошнія весткі з фронту пасеўнай

Па зьвестках Наркамзему па 57 раёнах БССР на 30 красавіка засеяна 34.320.35 га (падпакроўных траў—3179,4 га).

Калгасы засеялі яравых культур—19,172,22 га) падпакроўных траў 2944,4 га) і аднаасобнікі—14,384,2 га (

ТРУСАГАДОУЛЯ ПАВІННА СТАЦЬ
новай магутнай крыніцай рабочага забесьпячэньня

Аб чым гаворыць становішча трусаводнай гаспадаркі

Пя гледзячы на вялізарнае значэньне, якое мае трусагадоўля ў справе дадатковага атрыманьня мясных рэсурсаў для спажываньня працоўным гораду і вёскі, а таксама на вялікае значэньне шэрсьці і скурак трусоў у прамысловасьці, за апошняга часу гэта галіна гаспадаркі знаходзіцца ў нас у заняпадзе. На разьвіцьцё гэтай галіны народнай гаспадаркі яшчэ вельмі многія глядзяць як на «дзіцячую забаву» і недаацэньваюць тых каштоўнасьцяй, якія прыносіць трусагадоўля.

Пастанова ЦК і СНК аб фарсаваньні жывёлагадоўлі не знайшла яшчэ належнага пералому ў справе трусагадоўлі. Шмат якія арганізацыі, якія павінны займацца разьвіцьцём трусагадоўлі, працягваюць недаацэньваць арганізацыю і ўкамплектаваньне трусагадоўчых гаспадарак. Мінулы год даў вельмі нязначныя вынікі на фронце трусагадоўлі. Амаль усе арганізацыі значна недавыканалі пляну ўкамплектаваньня матачнага ядра. Паводле пляну ў 1931 годзе павінна было быць пастаўлена ў 66 трусагадоўчых гаспадарках 49.400 галоў. На справе-ж было пастаўлена толькі 17.400 галоў, што складае 35,4 проц. Белпушкатрэст павінен быў мець у сваіх 2-х гаспадарках 12.000 галоў. Фактычна ён меў на 1-га студзеня г. г. 3.100 галоў, што складае каля 25 проц. пляну.

Асабліва дрэнна разгортваецца трусагадоўля па лініі калгасаў. На працягу 1931 году замест вызначаных 20.000 галоў у калгасах было толькі 2.120 галоў, што складае 10,6 проц. Гэта лічба сігналізуе аб тым, што трусагадоўля стаіць па заўвагай Белкалгасцэнтру. Трусаводныя гаспадаркі не забясьпечаны патрэбнымі кармамі, не падрыхтаваны кадры, уся справа па арганізацыі і камплектаваньні трусагадоўчых гаспадарак праходзіць самацёкам. З прычыны недагляду заўважаецца значны адыход маладняка.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіцца справа трусагадоўлі і на лініі паляўнічага саюзу. У мінулым годзе гэта арганізацыя павінна была мець 31 трусагадоўчую гаспадарку 9 тысяч галоў. На справе-ж было пастаўлена 6.374 галавы, што складае 70,7 проц.

Дрэнна таксама стаіць справа і ў гаспадарках Белкапсаюзу, дзе замест 3.000 галоў было пастаўлена толькі 560 галоў.

Толькі Саюзпушніна і Белкапсампрамсаюз больш-менш здавальняюча справіліся з задачай камплектаваньня ў трусагадоўчых гаспадарках. Саюзпушніны нават перавыканаў плян па камплектаваньні: плян 4.400, пастаўлена 4.440; Белкапсампрамсаюз замест 1.000 галоў паставіў 900.

Гэтыя лічбы сігналізуюць аб тым, што трусагадоўля знаходзіцца ў поўным заняпадзе, што ёй не адводзіцца належнай увагі.

Таксама трэба адзначыць, што плян здачы таварнай прадукцыі за мінулы год выкананы ўсяго на 10,4 проц. Асабліва дрэнна справіліся з гэтай задачай гаспадаркі Менсампрамсаюзу і Калгасцэнтру, якія не здалі ніводнага цэнтнэра мяса. Дрэнна таксама справіліся са здачай таварнай прадукцыі паляўнічы саюз, які выканаў плян на 2,2 проц., Белкапсаюз—4,8 проц., Белпушніна—на 37 проц., Белпушкатрусатрэст—на 34,2 проц. Такое нязначнае выкананьне пляну па здачы таварнай прадукцыі зьяўляецца вынікам поўнай недаацэнкі трусагадоўлі, дрэнным дагляд ам адсутнасьцю правільнай арганізацыі працы ў гаспадарках, слабым вэтабслугоўваньнем і г. д.

На 1932 год вызначаны досыць вялікі плян па трусагадоўлі. Сёлета павінна быць арганізавана 294 гаспадаркі, у якіх павінна быць пастаўлена 116.000 галоў трусоў.

На працягу 1932 году па лініі птушкатрусатрэсту мае быць арганізавана 5 трусагадоўчых гаспадарак з агульнай колькасьцю 25.000 галоў; па калгаснай лініі 240 гаспадарак на 60.000 галоў, Белпушніна—9 гаспадарак—12.500 галоў Белкапсаюз—4 гаспадаркі—на 4.500 галоў, паляўнічы саюз—35 гаспадарак—11.500 галоў і Менсампрамсаюз—1 гаспадарка—на 2.500 галоў. Усяго мяркуецца сёлета арганізаваць 294 гаспадаркі, у якіх павінна быць пастаўлена 116.000 галоў. Трусагадоўчыя гаспадаркі павінны сёлета здаць дзяржаве 105.000 галоў таварных трусоў.

Выкананьне гэтага пляну вымагае ад партыйных, гаспадарчых і савецкіх арганізацый павярнуцца тварам да трусагадоўлі, забясьпечыўшы гаспадаркі патрэбнымі кармамі і неабходнымі кадрамі.

Праводзячы зараз веснавую сяўбу, вялікая ўвага павінна быць зьвернута на стварэньне ўласнай, моцнай кармавой базы. Пры складаньні севазвароту павінны быць улічаны запатрабаваньні трусагадоўлі. Трэба зараз-жа забясьпечыць усе трусагадоўчыя гаспадаркі насеньнем, каб з гэтага году яны маглі засеяць патрэбныя культуры і тым забясьпечыць стада неабходнымі кармамі.

Ня менш важнай справай зьяўляецца падрыхтоўка патрэбных кадраў.

Узьнімаючы трусагадоўлю на прынцыповую вышыню трэба адзначыць, што сам НКЗБ мала зьвяртае ўвагі на гэту адказнейшую галіну гаспадаркі. Да апошняга часу ў Наркамземе нічога ня ведаюць, што робіцца на мясцох, як разьвіваецца трусагадоўля. НКЗБ не займаецца рэгуляваньнем і плянаваньнем трусагадоўлі, ён толькі зьяўляецца рэгістратарам фактаў. К сораму трэба адзначыць, што да гэтага часу ў апараце Наркамзему справай трусагадоўлі займаецца птушкавод. Зразумелая рэч, што трусагадоўлі як «дадатковай нагрузцы» не надаецца належнай увагі.

Выгоднасьць трусагадоўлі ўсім вядома. Трэба толькі перамагчы косналь наших гаспадарчых савецкіх арганізацый.

І-ч.

Параўнаўчая пажыўнасьць розных відаў мяса і колькасьць адзінак кармоў неабходных для ўтварэньня аднаго кілёграму мяса

(Лічбы зьлева—процант спажыўных матэрый у адным кілёграме, Лічбы справа на стоўбіках—адзінкі кармоў).

ЯК ГАДАВАЦЬ ТРУСОУ

(Аддзел кансультац і)

Калі трусам будзем даваць мала корму, або будзем карміць адным кормам, напрыклад, канюшынаю ці кораньплодамі, дык яны будуць худзець і, урэшце, загінуць. Гэта тлума чыцца тым, што трус у сваім кармавым рацыёне не атрымаў усіх тых спажыўных матэрый, якія неабходны для харчаваньня арганізму.

Але калі трусу даць лішняга корму, дык ён яго не паесьць і пры гэтым трус пачне тлусьцець, што не заўсёды карысна.

Калі мы хочам выгадаваць добры маладняк, дык ён не павінен тлусьцець у часе разьвіцьця яго арганізму. Тлустая самка застаецца ў большасьці выпадкаў бясплоднаю, а то бываюць выпадкі выкідышаў. Ад тлустых самцоў у самкі бываюць прагулы. Ва ўсіх гэтых выпадках, як перакорм, так і недакорм аднолькава шкодны для трусоў і нясе гаспадарцы страты.

Калі мы хочам атрымаць ад разьвядзеньня трусоў больш карысьці, дык трэба даваць ім харчоў столькі, колькі патрабуе іх арганізм. Такая колькасьць харчоў завецца кармовою нормаю. Карміць трусоў па норме — значыць карміць па вазе, узважваць корм згодна ўстаноўленай нормы. Трусы ня ўвесь час патрабуюць аднолькавага корму. Вось прыкладны рацыён для трусоў:

Табліца кармавых рацыёнаў сена, аўса, бульбы, ячменнай мукі для трусоў сярэдняй пароды (норма ў грамах):

Узрост у месяцах	Сена	Бульба	Аўсё	Ячменная мука	Усяго за дзень
Ад 1 да 1½ месяца	10	—	8	10	28
» 1½ » 2 »	35	40	20	10	105
» 2 » 3 »	50	60	30	15	155
» 3 » 4 »	60	70	25	15	170
» 4 » 5 »	70	80	30	20	200
» 5 » 6 »	100	100	50	20	270
» 6 » 7 »	120	140	70	30	360
Маткам, якія кормяць 5 штук трусоў ад першага месяца . . .	170	140	110	80	500

У злучны пэрыяд трусы патрабуюць больш, а ў зімовыя месяцы—ў часе адпачынку патрабуюць менш корму.

Маладняк у пэрыяд росту патрабуе корму больш багатага бялкамі. Тамы кармавыя нормы бываюць рознымі ў розныя моманты жыцьця трусоў.

Карысныя харчы для трусоў наступныя і наступныя якасьці:

Сена, што даецца трусам, павінна быць бяз пылу і цьвілі, бо пыл, які попадае ў вочы і дыхальныя і страўныя органы, выклікае хваробу гэтых органаў, а таму пыльнае сена перад тым, як даваць трусом, неабходна ператорсьці.

Сэрадэлю, пунцовую канюшыну, чырвоную і белую канюшыну, адуван чык трусы ядуць з вялікаю ахвотаю. Гэтыя травы вельмі карысны для цяжарных і кормячых самак.

Трава з балотных месц зьяўляецца шкодным харчом для трусоў, бо ў ёй часта бываюць мікробы, якія прыносяць страўныя і бранхіяльныя хваробы. Бульба і бульбяныя лупіны даглядзе, маркоў даецца сырой. Маркоў добра ўплывае на рост поўсьці і якасьць скуркі. Бручку даюць у сырым і гатаваным выглядзе. Капуста, авёс, ячмень, пшано, гарох, боб, і кукуруза даюцца пакрышанымі а калі яны не пакрышаны, дык іх патрэбна на працягу сутак мачыць у вадзе. Жмыхі і вотрубі даюцца ў запараным выглядзе.

Табліца кармовых рацыёнаў з сена, бульбы, аўса, ячменнай мукі для трусоў буйных парод (норма ў грамах):

Узрост у месяцах	Сена	Бульба	Аўсё	Ячменная мука	Усяго за дзень
Ад 1 да 1½ месяца	10	—	10	10	30
» 1½ » 2 »	40	40	25	10	115
» 2 » 3 »	60	60	25	15	160
» 3 » 4 »	80	70	40	15	205
» 4 » 5 »	90	90	50	15	245
» 5 » 6 »	100	120	60	15	295
» 6 » 7 »	120	120	60	20	320
» 7 » 8 »	140	150	100	20	38.
Маткам, якія кормяць 5 штук трусоў ад першага месяца.	190	150	150	70	560

Сярод лугавых, балотных, лясных, палявых і гародных траў знаходзіцца шмат атрутных расьлін, якія выклікаюць хваробу сьлізістай абалонкі і страўнага апарату ў трусоў. Таму з вялікай асьцярожнасьцю трэба скар мліваць засьмечаныя травы садоў і гародаў. Да атрутных расьлін належаць наступныя: беляна, куколь, малачай, люцік, ветранка, мак, зялёная цьвятучая пшаніца, лукавічныя расьліны ўсіх відаў, плады, лісьця і кара костачкавых дрэў, лісьця фасолі, лісьця дуба і арэхавага дрэва, бульбянік у негатаваным выглядзе.

Дзякуючы беднасьці большасьці расьлін натрыем, карысна ў харч трусоў дадаваць солі з такога разрахунку: 1,5 грама на дарослага труса і 1 грам на дарослага маладняка. Для гэтага сена апырскваць салёнаю водаю або падсаліць пры варцы бульбы, ці мачыць авёс ў салёнай вадзе.

Трусы большай часткаю днём сьпяць, таму ўначы больш зьядаюць харчоў, чым днём і ўначы яны з большаю ахвотаю ядуць больш грубыя кармы. Да гэтага трэба прыстасоўвацца пры складаньні кармовых дач у розныя часы сутак. Харч даецца цяжарным, кормячым самкам і маладняку 3 разы на дзень.

Карміць трусоў трэба ў вызначаны час. Калі мы ня будзем прытрымлівацца гэтага часу, дык трусы з вялікай прагнасьцю накідваюцца на корм, хутка напаўняюць страўнік кепска пераражаным кормам, што парушае правільнае пераварваньне харчоў.

Кармець самак і самцоў да злучкі трэба так, каб яны ня былі надта тлустымі, бо ад вельмі ўкормленых самцоў самкі не запладняюцца, ці ста новяцца малаплоднымі.

К моманту цяжарнасьці самак неаб ходна паставіць у такія ўмовы, пры якіх магло-б ісьці правільнае разьвіцьцё зародкаў. Для гэтага цяжарным самкам трэба даваць корм багаты бялкамі і мінэральнымі матэрыямі, ў асаблівасьці фосфарна - вапнавымі солямі. Ад дрэннага корму цяжарных самак родзяцца слабыя трусы.

За пару дзён да акоту і за дзень пасьля акоту трэба зьменшыць дачу аўса і даць больш кашы з аўсянай мукі. Малады трус больш патрабуе мінэральных матэрый, а ў асаблівасьці вапны і фасфарытнай кісланы, якая ідзе на пабудову касьцей. Таму ў корм маладняку патрэбна дадаваць фосфарную муку з разьліку 0,5 грам. на кожную галаву маладняка. Кожны трусавод павінен ведаць наступныя правілы корму.

Корм павінен быць добраякасны. Неабходна сачыць за чыстатою кармушак з аднае кармушкі ў другую не перакідаць корм ня трэба, таксама ня трэба класьці корм на падлогу ў клеткі; кораньплоды неабходна перамываць, а авёс перасейваць праз рэшата. Кармы павінны быць па маг чымасьці рознастайнымі. Карміць трусоў трэба ў пэўны час. Пры разьвядзеньні трусоў у клетках, улетку іх кормяць травою ўвечары, або ўдзень, але не раніцою. Карміць трэба толькі па нормах. Пераход ад аднаго корму да другога напрыклад ад сухога да зялёнага і наадварот павінен праводзіцца асьцярожна і паступова.

Ад няправільнага корму падсосных самак хварэюць страўна - кішачнымі хваробамі амаль усе трусяняты, у выніку чаго яны гінуць ад паносу. Каб атрымаць ад трусагадоўлі добрыя вынікі трэба быць добрым гаспадаром.

Г—к.

На калгасных палёх.

Справе трусагадоўлі ў БССР аддаецца не заслужана мала ўвагі. Большасьць арганізацый, якія займаюцца гэтай справай, настольні далёка стаяць ад канкрэтнага практычнага кіраўніцтва разьвіцьцём трусагадоўчай гаспадаркі, што нават ня ведаюць абсваім статку. Няма пляну на 1932 год. У апаратах Белкапхарчтрэсту, Белсельгасаб'яднаньня пануе апартуністычная думка, шт займацца справай трусагадоўлі няма сэнсу, што ў Беларусі гэта ня выгодна, бо трусы... хварэюць катарам і г. д.

Мы патрабуем рэзкай зьмены адносін да трусоў, да іх мяса як магутнай дадатковай крыніцы рабочага забесьпячэньня. Наркамзем і трэсты ў бліжэйшыя дні павінны правесьці абмеркаваньне становішча трусагадоўчай гаспадаркі. Разам з каапэрацыйнымі і прафэсыянальнымі органамі неабходна намеціць канкрэтны плян разьвіцьця калгаснай і саўгаснай трусагадоўлі. Каапэрацыйныя арганізацыі павінны паставіць пытаньне аб арганізацыі такіх гаспадарак пры сталоўках. Ці не пара паставіць таксама пытаньне аб гадаваньні трусоў у рабочых пасёлках?

Мы чакаем адказу ад каапэрацыйных, трэстаўскіх і рабочых арганізацый аб іх канкрэтных мерапрыемствах.

За 2500 тон мяса + 1,5 млн. скурак

Трусагадоўля, як таварная галіна, мае вялікае народна-гаспадарчае значэньне. Да рэвалюцыі трусагадоўля была разьвіта вельмі слаба і зьяўлялася пераважна справай аматараў. Прымітыўная сельская гаспадарка дарэвалюцыйнага часу, нізкая пакупніцкая здольнасьць асноўнай масы насельніцтва не маглі стварыць базы для разьвіцьця трусагадоўлі.

Зусім іншыя задачы ставяцца зараз перад трусагадоўляй. Пастановай ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 30 чэрвеня 1931 году аб разьвіцьці жывёлагадоўлі былі вызначаны поўныя шляхі па фарсаваньні трусагадоўлі. Сацыялістычная трусагадоўля павінна адыграць вялікую ролю ў справе забесьпячэньня мясам рабочых гораду і зьвіцца сыравінай базай для футровай і фэтравай прамысловасьці.

Трус мае вялікае ўжываньне ў футровай прамысловасьці. Скурка яго, як у натуральным, такі і ў афарбаваным выглядзе ідзе на выпрацоўку розных відаў футры. Шэрсьць труса ідзе для вырабу фэтравых рэчаў. Скура яго значна больш моцная і мяккэйшая чым азечая і казіная. Яна выкарыстоўваецца ў радзе лёгкіх вырабаў і абутку. Трусіны клей, які вырабляецца з рэшткаў скуры, спажываецца на багетных фабрыках і для розных далікатных сталярных работ.

Трусіны пух зьяўляецца добрай сыравінай для вырабу вязаных рэчаў. Мяса труса мае высокую якасьць і па ўтрыманьні бялка і тлушчы стаіць на першым месцы сярод іншых відаў мяса.

Трусагадоўля мае наступныя перавагі перад іншымі відамі жывёлагадоўлі:

1. Трус у 5—6 месячным узросьце ўжо можа пладзіцца ці выкарыстоўвацца на адкорм.

2. Трус можа даць 4 памёты на працягу году, і правесьці ў кожным памёце па 5—7—10 і больш трусянят, частка якіх у сваю чаргу дасягае сьпеласьці ў тым жа годзе. Пры 5 самках і 1 самцы ўжо на 3-ці год можна атрымаць больш 2.000 маладняка.

3. Трус лёгка пладзіцца ва ўмовах рознага клімату, ён не баіцца холаду і не патрабуе ўцяплённых памяшканьняў.

4. Трус добра спажывае самыя грубыя і танныя расьлінныя кармы і розныя адкіды.

5. Убойная вага труса пасьля 2-х тыднёвага адкорму дае 70—75 проц. жывой вагі.

З усяго гэтага відаць, што ў справе вырашэньня мясной праблемы і паляпшаньні рабочага забесьпячэньня, трус мае надта вялікае значэньне. Арганізацыя сацыялістычных спецыялізаваных трусагадоўчых гаспадарак—саўгасаў і калгасаў можа зьявіцца вялікай падмогай у справе забесьпячэньня працоўнага насельніцтва мяснымі прадуктамі і нашай прамысловасьці неабходнай сыравінай.

У капіталістычных краінах доля трусінага мяса ў агульным мясным балянсе досыць значнае. У Амэрыцы зьядаюць у год больш 50.000 тон трусінага мяса на суму ў 30 мільёнаў руб., ня лічучы выкарыстаньня трусінага мяса на кармленьне дзікіх футровых зьвярэй, якія разводзяцца ў ня волі. Нью-Фаўндленд (Паўночная Амэрыка) стварыў у сябе буйную кансэрвавую прамысловасьць выключна на базе трусінага мяса. Экспарт трусіных кансэрваў складае адну з галоўных галін вывазу Амэрыкі.

Таксама шырока паставлена разьвіцьцё трусагадоўлі ў Францыі, дзе ў 1926 годзе было прадана трусінага мяса на 160 млн. руб. У Англіі трусінае мяса ў мясным балянсе таксама займае віднае месца. Ня менш важную ролю адыгрывае трусагадоўля і ў іншых капіталістычных краінах.

У Савецкім саюзе разьвіцьцё трусагадоўлі, павінна праходзіць у плянавым парадку. Рост дабрабыту працоўных гораду і вёскі выклікае значнае павялічэньне спажываньня мясных прадуктаў. З другога боку, шырокае разьвіцьцё трусагадоўлі павінна папоўніць той недахоп у сыравінай базе, якую адчувае зараз наша пушнафутровая прамысловасьць, з прычыны павышэньня попыту на футровыя тавары з боку насельніцтва.

Выкананьне шырокай праграмы разьвіцьця трусагадоўлі магчыма толькі на базе буйнай сацыялістычнай вытворчасьці. У спецыялізаваных трусагадоўчых гаспадарках—саўгасах і калгасах, мы зможам дабіцца вырашэньня кармавой праблемы, эканомна выкарыстаць усе рэшткі кармавых рэсурсаў, належна арганізаваць дагляд за маладняком і дабіцца максымальнага скарочаньня адыходу як дарослага стада, так і маладняка.

Бягучы год павінен зьявіцца рашаючым у справе арганізацыі труса гадоўчых гаспадарак. Неабходна зараз-жа забясьпечыць гаспадаркі патрэбнай кармовай базай, для чаго ў часе веснавой сяўбы павінны быць улічаны ўсе патрэбы трусагадоўлі. БССР павінна мець у першы год другой пяцігодкі матачнае стада ў 116,000 галоў, якое павінна даць у 1932-33 г.—2.500 тон трусінага мяса і 1,5 млн. трусіных скурак.

Галубчын.

Трусы гінуць ад безгаспадарчасьці і абязьлічкі

Прыгарадная гаспадарка Курасоўшчына зьяўляецца досыць буйным трусагадоўчым саўгасам. У сучасны момант у гаспадарцы знаходзіцца каля 800 галоў племянога стада. Трусятнікі нядаўна пабудаваны і належна абсталяваны. Гаспадарка мае ўсе магчымасьці для нармальнага разьвіцьця. Аднак на справе гэтага няма. Ня гледзячы на тое, што Курасоўшчына знаходзіцца за 3 кілёмэтры ад г. Менску што ў гаспадарку амаль штодня езьдзяць прадстаўнікі з Белпушніны (гаспадарка знаходзіцца ў веданьні Белпушніны), трусы не карыстаюцца належнай увагай. У гаспадарцы навуюць вялікія непаразкі, дагляд за матачным ядром і за маладняком дрэнны.

Варта адзначыць, што на працягу апошняй зімы ў гаспадарцы зьмяніла ся 6 кіраўнікоў. Не пасьпее адзін дырэктар азнаёміцца са справай, як ужо яго трэба пакідаць гаспадарку.

Працоўная дысцыпліна вельмі слабая. Загадчык гаспадаркі 30 красавіка пакінуў гаспадарку і паехаў некуды бадзяваць, вярнуўшыся толькі 4-га мая. Між тым, справа дайшла да таго, што 2-га мая ніхто амаль не хацеў дагледаць за трусамі. Гэта матло-б прывесьці да гібелі трусоў і толькі дзякуючы таму, што сярод дагледчыц ёсьць адна камсамоўка, якая арганізавала догляд за трусамі ў гэты дзень, быў выратаваны ад сьмерці высока-каштоўны маладняк.

Органы пракуратуры павінны неадкладна пацікавіцца станам саўгасу Курасоўшчына. Вінаватыя ў развале гаспадаркі павінны панесьці суровую адказнасьць. Неабходна зараз жа выратаваць трусоў ад безгаспадарчасьці і абязьлічкі. Трэба зараз-жа паставіць у Курасоўшчыну аўтарытэтнага кіраўніка, які-бы забясьпечыў пасьпяховае правядзеньне сяўбы і поўнае выкананьне пляну трусагадоўлі.

К. І

Г. Чарвякова

Чарговыя задачы ў барацьбе за пісьменнасьць

БССР мае вялізарныя посьпехі ў барацьбе з няпісьменнасьцю. Рад буйнейшых пралетарскіх цэнтраў, раёнаў, прадпрыемстваў і калгасаў прыйшлі да 1 мая суцэльна пісьменнымі. Мы маем зараз 95 проц. пісьменных ва ўзросьце ад 16 да 45-50 год.

Аднак, кажучы аб нашых дасягненьнях у гэтай галіне, мы ў той-жа час павінны разумець, што гэтыя посьпехі зьяўляюцца толькі першым этапам у барацьбе за пісьменнасьць, што па паасобных вучастках задача ліквідацыі няпісьменнасьці яшчэ ня вырашана канчаткова.

Мы павінны з усёй рашучасьцю пакіраваць усе свае сілы, каб ня спыняючы тэмпаў, неадкладна зьнішчыць маючыяся на паасобных лікпунктах прарывы і на працягу бліжэйшых месяцаў задачу ліквідацыі няпісьменнасьці далжам вырашыць.

Уладзімір Ільліч Ленін паказваў, што ў краіне няпісьменнай пабудаваць камуністычнага грамадзтва нельга.

Каб выканаць гэта паказаньне Уладзіміра Ільліча Леніна нельга абмяжоўвацца першапачатковай пісьменнасьцю, што набывае дарослае насельніцтва на лікпунктах. Першапачатковая пісьменнасьць зьяўляецца толькі першым крокам для далейшага набываньня ведаў, патрэбных грамадзянам савецкай рэспублікі для актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве і барацьбе пад кіраўніцтвам партыі за перамогу сацыялізму.

«Мы ведаем,—казаў тав. Ленін,—што камуністычнай грамады нельга пабудаваць, калі не адрадзіць прамысловасьці і сельскай гаспадаркі... Трэба адрадзіць іх на сучасных, на апошняму слову тэхнікі, пабудаваных асновах... Гэтай асновай зьяўляецца электрычнасьць... Толькі калі адбудзецца электрыфікацыі ўсёй краіны, усіх галін прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, калі вы гэтую задачу асвоіце, толькі тады вы для сябе зможаце пабудаваць камуністычнае грамадзтва».

XVII партыйная канфэрэнцыя паставіла перад намі асноўнай гаспадарчай задачай—перабудову ўсёй народнай гаспадаркі Савецкага саюзу на новай тэхнічнай базе, прычым у аснову разьвіцьця народнай гаспадаркі пакладзена разьвіцьцё энэргетычных рэсурсаў краіны і электрыфікацыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Уладзімір Ільліч Ленін казаў: «Вы добра разумееце, што да электрыфікацыі няпісьменныя людзі ня падыйдуць. Ім мала тут адной проста пісьменнасьці, тут недастаткова разумець, што такое электрычнасьць, трэба ведаць, як тэхнічна прыладзіць электрычнасьць—і да прамысловасьці, і да сельскай гаспадаркі, і да паасобных галін прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Трэба навучыцца гэтаму самім, трэба навучыць гэтаму ўсё падрастаючае працоўнае пакаленьне».

Услед за вырашэньнем задачы паратаваньні БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці ўзьнікае задача, каб узьняць пісьменнасьць на больш высокую ступень, каб праз палітэхнізацыю школ азнаёміць працоўнае насельніцтва з асноўнымі ведамі і працасамі вытворчасьці, праз спецыялізацыю школ падрыхтаваць кадры, здольныя праводзіць у жыцьцё лёзунг правадыра партыі і рабочае клясы тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай.

Трэба зьнішчыць няправільны і шкодны погляд быццам ліквідацыя няпісьменнасьці—гэта ёсьць часовая кампанія, якая ажыцьцяўляецца курсамі і што гэтая работа можа быць у бліжэйшы час спынена. Таму трэба навесьці рашучую барацьбу супроць імкненьняў спыніць работу ліквпунктаў (школ для малапісьменных) у зьвязку з надыходзячым летам, у зьвязку з надыходзячымі сельска-гаспадарчымі вясеньнімі і летнімі работамі. Работа ліквпунктаў ня можа і не павінна быць спынена. Яна павінна працягвацца, праўда, улічыўшы асаблівасьці летняга сэзону, прыстасаваўшыся да гэтых асаблівасьцяй. Аднак, гэта зусім ня значыць, што тут работа можа насіць выпадковы характар, час ад часу ў розныя тэрміны і г. д. Каб мець сталыя посьпехі трэба з самага пачатку паставіць работу ліквпунктаў летам на цьвёрдых асновах. У гэтых мэтах трэба арганізаваць чоткі вучот няпісьменных, не ліквідаваўшых сваю няпісьменнасьць да 1-га мая. У першую чаргу гэта датычыцца дапрызыўнікаў і наогул больш малодшых узростаў. Трэба вызначыць цьвёрдыя тэрміны работы ліквпунктаў і дамагацца таго, каб гэтыя тэрміны цьвёрда выконваліся як настаўнікамі, культармейцамі, так і вучнямі.

Трэба ўлічыць масавае адыходніцтва ў летні пэрыяд і накіраваць сваю ўвагу для таго, каб ахапіць работаю ліквпунктаў рабочых дарожнага будаўніцтва, лесасплаву, будаўнічых рабочых наогул, саўгасіх рабочых, калгасьнікаў і г. д. Праграма работы ліквпунктаў павінна быць пабудавана такім парадкам, каб забясьпечыць набыцьцё мінімума ведаў па грамадазнаўству, а таксама асноўных ведаў у вёсцы па агразоамінімуму.

Трэба неадкладна прыступіць да арганізацыі школ малапісьменных. З гэтай мэтай трэба арганізаваць вучот малапісьменных у кожным сельсавеце, вучот культармейцаў, трэба арганізаваць разьмеркаваньне і замацаваньне малапісьменных за школамі малапісьменных і неадкладна арганізаваць работу школ малапісьменных. Асабліва ўвага зноў такі павінна быць гвэрнута на больш малодшыя ўзросты. Уся праца ліквпунктаў і школ малапісьменных павінна ўвязвацца з агульнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

У мэтах ажыцьцяўленьня гэтых задач у першай палове мая трэба арганізаваць канфэрэнцыі настаўніцтва і культармейцаў у сельсаветах, на якіх абгаварыць зьвязаныя з гэтым пытаньні, выпрацаваць канкрэтны плян работы для таго, каб расставіўшы сілы прыступіць непасрэдна да практычнай работы.

Вынікі работы за мінулы час паказваюць нізкую якасьць работы ліквпунктаў, школ малапісьменных. Дырэктывы аб увядзеньні курсаў грамадазнаўства, аб укараненьні агразоаведаў на ліквпунктах выконваліся ў вельмі слабай ступені. Гэта тлумачылася цэлым радам прычын, да ліку якіх трэба адносіць: досыць слабую якасьць ведаў нашых культармейцаў, выпадковы характар работы паасобных ліквпунктаў і г. д. На якасьць працы трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

Асобна трэба спыніцца на ролі ў гэтай справе камсамолу, прафсаюзаў і таварыстваў «Проч няпісьменнасьць».

Перад намі Камуністычная партыя паставіла вялізарнейшыя задачы. Гэтыя задачы могуць быць вырашаны толькі на падставе скарыстаньня ініцыятывы ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Трэба прызнаць, што мы далёка яшчэ ня ўмеем на мясцох скары стоўваць рэвалюцыйны запал камсамолу, ня ўмеем дапамагаць камсамольцам у ажыцьцяўленьні імі, вызначаных для камсамолу партыяй і ЦК камсамола задач. Улічваючы гэта мы павінны ўстаўавіць на мясцох самую шчыльную сувязь з камсамольскімі арганізацыямі, ажыцьцяўляючы ўсе асноўныя мерапрыемствы як па ліквідацыі няпісьменнасьці, так і малапісьменнасьці разам з камсамолам і праз камсамол.

Работа ў вёсцы патрабуе пастаяннага жывога кіраўніцтва і ўплыву з боку рабочай клясы. Гэта вызначае і ролю прафсаюзаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Перад прафсаюзнымі арганізацыямі стаіць задача дажыўленьня дзейнасьці шэфскіх таварыстваў і накіраваньня іх увагі ў бок дапамогі вёсцы.

Шэфскія таварыствы, зьвязаныя з калгасамі, саўгасамі, паасобнымі вёскамі могуць значна дапамагчы ў зьнішчэньні раду недахопаў, якія зьяўляюцца перашкодамі ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці.

Мабілізаваць рэсурсы шляхам эканоміі паперы, пісьмовых прыладаў, на кіраваць на пэўны час у вёску настаўнікаў, лектароў, кіно, дапамагчы ў арганізацыі радыё, садзейнічаць заахвочваньню лепшых ударнікаў-культармейцаў, дапамагчы сваімі парадамі і кіраўніцтвам—вось тыя практычныя задачы, што стаяць перад прафсаюзнымі арганізацыямі ў гэтай галіне.

Задачы т-ва «Проч няпісьменнасьць» застаюцца і на даным этапе вельмі значнымі. Мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць, за аўладаньне тэхнікай працоўнымі масамі, за ўзьнясьце пісьменнасьці на больш высокую ступень—вось чым павінны кіравацца ячэйкі т-ва «Проч няпісьменнасьць» у сваёй далейшай рабоце.

Не паслабляючы барацьбы з рэшткамі няпісьменнасьці, т-ва «Проч няпісьменнасьць» усю сваю далейшую работу павінна перабудаваць у адпаведнасьці з рашэньнямі XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, з рашэньнямі сакавіцкага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)В.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Пратэст генэральнага консула СССР у Харбіне

У сувязі з арыштамі савецкіх грамадзян у Паўночнай Манчжурыі, генэральны консул СССР у Харбіне тав. Славуцкі накіраваў 28 красавіка 1932 г. Харбінскаму дыпкамісару ліст, у якім гаворыцца:

«Я неаднаразова зьвяртаў вашу ўвагу на правакацыйны характар дзейнасьці белых расійскіх чыноў паліцыі, якія арыштоўваюць ня чым не вінаватых савецкіх грамадзян і, шляхам досыць вядомых усім, і асабліва савецкім грамадзянам, правакатарскіх мэтадаў, пэрокі вопыт якавых гэтыя чыны атрымалі ў былой царскай расійскай паліцыі, спрабуюць кампрамэтаваць савецкіх грамадзян і нават афіцыйныя савецкія ўстановы. Арыштаваных савецкіх грамадзян трымаюць у выключна цяжкіх умовах. Да іх ужываюцца барбарскія катаваньні, каб прымусіць іх «прызнацца» ў злачынствах, у якіх яны не вінаваты і да якіх яны ня маюць ніякіх адносін і пацьвердзіць правільнасьць паказаньняў «пакаўшыхся» арыштаваных, якія ў сапраўднасьці зьяўляюцца агентамі расійскай белагвардзейшчыны, што дзейнічае ў поўным кантакце з белымі расійскімі чынамі паліцыі. Савецкім грамадзянам падкідаюцца кампрамэтуючыя дакументы і рэчы для атрыманьня «ўлік або рэчавых доказаў». Аб адным такім канкрэтным выпадку я ўжо паведаміў лістом 21 красавіка. Сёньня мною атрымана заява ад савецкага грамадзяніна Рацько, які зьяўляецца нагледчыком будынку 6-га акалодку гараддзелу службы КУЧ і які па сваім абавязку мае права агляду на сваім вучастку дамоў і кватэр, належачых КУЧ. Згодна заявы, 27 красавіка Рацько быў выкліканы ў вышукную паліцыю, дзе ў прысутнасьці трох другіх расійскіх белых чыноў паліцыі—сярод якіх быў небезьвядомы Дарашкевіч, расійскі наглядач вышукной паліцыі Фэактыскаў прапанаваў грамадзянину Рацько, карыстаючыся яго правам пад выглядам неабходнасьці абмеру кватэры, наведаць дом КУЧ, у якім пражывае сакратар генконсульства СССР Пятроў, каб спэцыяльны агент паліцыі, які яго суправаджаў, мог у часе абмеру няпрыкметна «агледзець кватэру і зрабіць сваю справу».

Калі апаломлены гэтай ганебнасьцю Рацько адхіліў абураючую па сваёй нахабнасьці і правакатарскім характары прапанову, наглядач Фэактыскаў выставіў яго ў другі пакой, затым праз 15 хвілін, відаць, параіўшыся з іншымі членамі паліцыі і, спалохаўшыся, што Рацько паведаміць аб адбыўшымся генконсульства, пад пагрозай патрабаваў ад Рацько, каб ён нікому не расказваў аб зробленай ім прапанове. Як мне зрабілася вядома Фэактыскаў, Дарашкевіч і інш. былыя расійскія чыны, цяпер высьвятляюць магчымасьць правядзеньня іх правакацыйных намераў праз іншых наглядальнікаў будынкаў, у першую чаргу праз эмігрантаў кітайскіх падданых. Мне няма чаго шмат гаварыць наконт сапраўдных намераў расійскіх белабандыцкіх чыноў, наконт характару сьледзтва, якое вядзецца ў паліцыі, калі ўлічыць, што сьледзтва сканцэнтравана ў руках белых чыноў паліцыі. На іх правакацыйную дзейнасьць, правакатарскі характар масавых арыштаў саўграмадзян, меў шых месца ў Харбіне і на лініі УК чыгункі я неаднаразова зьвяртаў увагу вашу і іншых вышэйшых прадстаўнікоў ОРВП. На мой вялікі жаль я змушаны канстатаваць, што мае не аднаразовыя звароты аб необходнасьці строгага расьледваньня дзеяньняў белабандыцкіх паліцэйскіх элемэнтаў ня толькі засталіся без вынікаў, але дзеяньні апошніх робяцца з кожным днём усе больш небясьпечнымі і бязумоўна маюць сваёй непасрэдной мэтаю парушэньне існуючых адносін паміж СССР і Манчжурыяй і міру на Далёкім Усходзе. Іменна ў гэтым сэнсе робіцца зразумелымі апошнія інцыдэнты на лініі УК чыгункі і ня спыняемыя па сутнасьці анты-савецкія дэманстрацыі былых чыгуначных служачых, імем якіх па крываюцца белабандыцкія элемэнты, сувязь якіх з паліцыяй відавочна, і таму ня буду затрудняць вашу ўвагу паданьнем ўсім вядомых фактаў. Толькі ў імкненьні стварыць пагрозу існуючым адносінам паміж СССР і Манчжурыяй і міру на Д.-Усходзе—трэба шукаць прычыны таго, што белабандыцкія элемэнты, якія маюць усім вядомую вялізарную праваматарскую анты-савецкую практыку ў Манчжурыі, адкрыта пашыраюць сваю правакацыйную дзейнасьць, накіраваную ўжо непасрэдна супроць генконсульства СССР, яго адказных супрацоўнікаў, прадстаўнікоў СССР на КУЧ і іншых савецкіх устаноў і грамадзян.

Пратэстуючы самім энэргічным чынам супроць вышэйпералічаных бяспрыкладных па сваёй ганебнасьці дзеяньняў белабандыцкіх чыноў паліцыі, зноў настойліва прашу вышэйшыя ўлады прыняць неадкладна меры да самага суровага расьледваньня дзеяньняў паліцэйскіх агентаў, да адхіленьня ад пасадаў і адданьня суду белабандыцкіх пракатараў Фэактыстава, Дарашкевіча і інш. расійскіх чыноў, замешаных у апошніх анты-савецкіх праваматарскіх мерапрыемствах, да вызваленьня ня ў чым не вінаватых арыштаваных саўграмадзян, у прыватнасьці, адказнага супрацоўніка гандлёвага прадстаўніцтва СССР Сучаленка, які быў выведзены паліцэйскімі агентамі з больницы, дзе знаходзіўся на лячэньні. Разам з тым, канстатуючы яшчэ раз, што арыштаваныя саўграмадзяне знаходзяцца ў выключна цяжкіх умовах, што нельга было ўтоіць ад віцэ-консула Сапронава, які наведаў толькі частку арыштаваных, ня гледячы на тое, што наведваньне было абстаўлена радам агаворак, што Сапронаву паказалі толькі трэцюю частку арыштаваных, я прошу гаваю энэргічна настойваць на неадкладнай зьмене рэжыму ўтрыманьня арыштаваных і ўмоваў абыходжаньня з імі і дазволу нармальнага наведваньня прадстаўніком генконсульства ўсіх арыштаваных. Усклаўшы адказнасьць на ўладу асобнага раёну за далейшыя правакатарскія дзеяньні белых расійскіх чыноў паліцыі, лічу необходным асобна прасіць не дапусьціць ужыцьця Фэактыставым сваёй пагрозы ў адносінах савецкага грамадзяніна Рацько, які падаў прыкладную заяву».

Нанкінская кліка капітулявала

ШАНХАЙ. 5-IV. Агэнцтва паведамляе тэкст мірнай згоды. Апошняя складаецца з наступных 5-ці пунктаў і 3-х дадаткаў:

1-шы пункт прадугледжвае поўнае спыненьне варожых дзеяньняў, пачынаючы з 5 мая. Войска абедзьвюх дзяржаў, наколькі гэта ад іх залежыць, спыняюць усе формы варожых актаў у раёне Шанхаю. Калі ўзьнікнуць сумненьні адносна спыненьня варожых дзеяньняў, стаўкоўшча спраў павінна быць пасьведчана прадстаўнікамі трэціх дзяржаў—удзельнікаў згоды.

2-гі пункт зазначае, што кітайскае войска застаецца на сучасных пазыцыях аж-да наступных рашэньняў адносна аднаўленьня нармальных умоў у раёнах, аб якіх сутарка ідзе ў гэтай згодзе. Пазыцыі кітайскага войска ўказаны ў дадатку першым.

3-ці пункт зазначае, што японскае войска адкліваецца на тэрыторыю чужаземнага сэтльмэнту, у раён дарог, што ідуць в сэтльмэнту ў Ханкоў і ў раён Ханкю як-гэта было да інцыдэнту 28 студзеня. Мяркуецца, што з прычыны значнай колькасьці японскага войска, якое павінна быць размешчана, частка яго будзе расквацтаравана ў мясцох, прымежных да вышэйказаных раёнаў. Гэтыя месцы паказаны ў дадатку 2-гім.

4-ты пункт прадугледжвае стварэньне мяшанай камісіі, улічаючы прадстаўнікоў трэціх дзяржаў, што ўдзельнічаюць у заключэньні згоды. Камісія сьведчыць адкліканьне абодвых бакамі войска і супрацоўнічае ў справе перадачы кітайскай паліцыі эвакуаваных японскім войскам раёнаў. Кітайская паліцыя займае гэтыя раёны па меры адкліканьня японскага войска. Склад і працэдура работы камісіі вызначаецца дадаткам 3-м.

5-ты пункт зазначае, што згода набывае моц са дня падпісаньня.

Першы дадатак вызначае лінію размяшчэньня кітайскага войска: ад раёну р. Сучжоў да пункту Хупэйксу на р. Янцзы. У выпадку ўзьнікненьня сумненьняў, разьмяшчэньне кітайскага войска павінна быць пасьведчана прадстаўнікамі трэціх дзяржаў, што ўдзельнічаюць у заключэньні згоды.

2-гі дадатак вызначае раёны, прадугледжваемыя п. 3-м зазначае, што па ўзаемнай згодзе з раёну разьяднічэньня японскага войска выключаецца в. Усун і некаторыя іншыя пункты, а таксама, што японскія ўлады ня будуць дазваляць у апэрацыі Шанхай-Усунскай чыгункі і яе майстэрняў. У дадатку зазначацца, што адкліканьне японскага войска пачнецца на працягу бліжэйшага тыдню і будзе поўнасьцю закончана на працягу бліжэйшых 4-х тыдняў з моманту яго пачатку.

3-ці дадатак зазначае, што мяшаная камісія складаецца з 12 членаў, а іменна: па адным прамадзянскім і па 1-м вайсковым прадстаўніку ад кітайскага, японскага, амэрыканскага, ангельскага, францускага і італьянскага ўрадаў. Камісія можа прыцягнуць такую колькасьць памочнікаў, якую яна палічыць неабходным. Рашэньні камісіі прымаюцца большасьцю галасоў. Старшыня камісіі карыстаецца рашаючым голасам пры роўнасьці галасоў. Старшыня камісіі павінен быць абраны з ліку членаў камісіі, прадстаўленых трэцім дзяржаў, што ўдзельнічаюць у заключэньні згоды. Камісія павінна наглядаць за правядзеньнем у жыцьцё 1-га, 2-га і 3-га пунктаў згоды і ўлічваючы зьвяртаць увагу на выпадкі парушэньня згоды.

У сувязі з падпісаньнем згоды, кітайскі ўрад апублікаваў дэкларацыю, у якой заяўляе, што «у мэтах палегчаньня агульнага становішча і дасягненьня хуткага аднаўленьня ўстойлівасьці і нармальнасьці ўмоў у пацярпеўшых раёнах, кітайскі ўрад мае намер, па сваёй уласнай ініцыятыве неадкладна зазнаваць спэцыяльныя паліцэйскія сілы для падтрымкі міру і парадку ў эвакуаваных раёнах і ў раёнах, прылягаючых да чужаземнага сэтльмэнту. Кітайскі ўрад мае намер скарыстаць экспэртаў у вакасьці афіцэраў і інструктароў гэтых сіл. Мяркуецца, што кітайскія паліцыя, якая павінна заняць раёны, эвакуаваны японскім войскам, будзе складзена з вышэйпаказаных спэцыяльных паліцэйскіх сіл.

Словы і справы японскіх імпэрыялістаў

Японскія жандары, белагвардзейцы і кітайская паліцыя катуюць савецкіх грамадзян у харбінскіх засьценках

ХАБАРАЎСК. 4-5. Паводле поўных даных, некаторыя з арыштаваных у Харбіне савецкіх грамадзян катуюцца. Японская жандармэрыя пры допыце арыштаваных савецкіх грамадзян ужывае рознага роду катаваньні. Белагвардзейцы паліцэйскія ў сыскным аддзяленьні кітайскай паліцыі асобнага раёну ўсходніх правінцый (ОРВП) практыкуюць ўлізаньне ў нос тытуновага раствору. Устаноўлена, што катаваньням падвергаліся сакратар службы агульных спраў кіраўніцтва КУ чыгункі Гайдук і жонка супрацоўніка КУ чыгункі Аўчынікава. Арыштаваных трымаюць у вельмі цяжкіх умовах: многія закуты ў кайданы. Колькасьць арыштаваных савецкіх грамадзян на сёньняшні дзень перавышае 100 чалавек. Аднак, сыскное аддзяленьне кітайскай паліцыі ОРВП ня можа прадявіць нікому ніякіх крэдытных абвінавачаньняў таму, што во быск ня даў ніякіх вынікаў, а агентурныя матар'ялы адсутнічаюць.

Арышты праводзяцца, галоўным чынам, японскай жандармэрыяй і паліцыяй у Харбіне. Многіх з арыштаваных для паправадзяга дазнаньня трымаюць пры японскай жандармэрыі, што знаходзіцца ў складзе Харбінскага японскага генконсульства. Тольці пасьля дазнаньня арыштаваных перадаюцца у сыскное аддзяленьне кітайскай паліцыі ОРВП.

Галадоўка арыштаваных у Харбіне

ХАБАРАЎСК. 4-5. Паводле вестак, атрыманых з Харбіну, арыштаваныя за апошнія часы па правакацыйным абвінавачаньні ва ўзрыве мастоў і чыгуначных пабудоў савецкія грамадзяне абвясьцілі ўчора галадоўку ў адзнаку пратэсту супроць бесчалавечных прыёмаў допыту, барбарскага рэжыму і непрад'яўленьня дагэтуль абвінавачаньня.

Галадаюць 106 чалавек. Арыштаваныя патрабуюць прад'яўленьня ім абвінавачаньня і нармальнага судовага разгляду, палепшаньня рэжыму і абыходжаньня і вызваленьня асоб, арыштаваных у якасьці заложнікаў. Палітычны загадана прэсе поўнасьцю маўчаць аб галадоўцы, якая зьяўляецца вынікам «цывілізаваных» мэтадаў расправы з савецкімі грамадзянамі, што ўжываюцца «саветнікам» Харбінскай паліцыі японцам Ягі і яго белагвардзейскімі падручнымі.

Абмен лістамі паміж генсакратаром Лігі нацый Дрэмондам і тав. Літвінавым

ПАРЫЖ. 26-IV. «Пці Парызьен» паведамляе з Жэнэвы: «Літвінаў перад ад'ездам у Маскву паведаміў сакратарыят Лігі нацый, што ён ня можа задаволіць просьбу аб дазволе савецкім консулам у Манчжурыі даваць інфармацыю камісіі Літона.

Паводле атрыманых ТАСС вестак, у Жэнэве паміж генэральным сакратаром Лігі нацый Эрыкам Дрэмондам і тав. Літвінавым адбыўся наступны абмен лістамі.

Ліст генэральнага сакратара Лігі нацый сэра Эрыка Дрэмонда на імя народнага камісара замежных спраў і старшыні савецкай дэлегацыі на канфэрэнцыі па разбраеньні тав. Літвінава ад 20 красавіка 1932 г.

«Пан народны камісар!

Лёрд Літон, старшыня камісіі, якая знаходзіцца на Далёкім Усходзе, з мэтаю падрыхтаваньня дакладу радзе Лігі нацый па спрэчных пытаньнях паміж Кітаем і Японіяй, канфідэнцыйна паведаміў мяне, што, па думцы кажмісіі, яе задача ў Манчжурыі была-б аблегчана, калі-б яна магла атрымаць інфармацыю і сьведчаньні ад афіцыйных савецкіх асоб у Манчжурыі. Лёрд Літон запытвае ці будуць прэчаньні з боку савецкага ўраду супроць такога кроку.

Буду вам удзячны за ўсякую дапамогу і параду, якую вы маглі-б нам даць у гэтай справе. Прымеце і г. д.

Падпісана Э. Дрэмонд.

Адказ тав. Літвінава

Жэнэва, 22 красавіка 1932 г.

Пан генэральны сакратар!

У адказ на ваш ліст ад 20 красавіка маю гонар паведаміць наступнае: савецкі ўрад гатоў быў аказаць магчымую садзейнасьць любой камісіі, якая шчыра хацела-б вывяіць сапраўднае становішча рэчаў у Манчжурыі і сапраўды хацеў-бы ўладзіць ваенныя канфлікты, якія зараз адбываюцца ў Кітаі. Аднак, савецкі ўрад, які не ўваходзіць у склад Лігі нацый і ня прымаў удзелу ў разглядзе падзей, што зараз адбываюцца ў Кітаі, як і ў канструяваньні камісіі лёрда Літона, і які ня меў свайго прадстаўніка ў складзе камісіі, пазбаўлены, такім чынам, магчымасьці забясьпечыць належныя адносіны да інфармацыі прадстаўнікоў СССР і ня змог-бы тым самым узяць на сябе адказнасьць за вывады, якія могуць быць зроблены камісіяй Лігі нацый. Пры такіх акалічнасьцях савецкі ўрад лічыць сябе прымушаным адказаць на ваша запытаньне адмоўна.

Падпісана: Літвінаў.

Забарона пралетарскага саюзу свабодамысьлячых

БЭРЛІН. 4-V. Апублікаваны новы надзвычайны дэкрэт ураду Брюнінга. Згодна дэкрэту ўсе палітычныя саюзы, што носяць ваенны характар, падлягаюць кантролю германскага міністра ўнутраных спраў Грэнэра. Дэкрэт дае германскаму ўраду магчымасьць трымаць пад сваім кантролем усе палітычныя арганізацыі і распускаць іх, калі яны «падрываюць» аўтарытэт дзяржавы. Саюзы, якія не падпарадкоўцца распараджэньням міністра ўнутраных спраў, могуць быць распушчаны.

Апроч таго апублікаваны другі надзвычайны дэкрэт Гіндэнбурга аб роспуску па ўсёй Германіі арганізацыі рэвалюцыйных свабодамысьлячых (ва яўлічых бязбожнікаў), якія ахапляюць 150.000 членаў, большасьць якіх беспартыйныя рабочыя. Роспуску падлягаюць: міжнародная арганізацыя пралетарскіх свабодамысьлячых, выканком якіх знаходзіцца ў Бэрліне і далучаныя да ёй германскія арганізацыі свабодамысьлячых: свабодамысьлячай моладзі, жанчын і піянэраў. У далейшым за ўдзел ва ўсіх гэтых арганізацыях і прасьледваньне пастаўленых імі мэтаў пагражае зьняволеньне.

У паход за сацыялістычны чырвонец

Паход за сацыялістычны чырвонец, які разгарнуўся па БССР па ініцыятыве рабочых віцебскай фабрыкі «Прафінтэрн» зьяўляецца адной з форм ма савай работы па больш поўным ўцягненьні праз сыстэму ашчаджаючых часова вольных сродкаў насельніцтва на сацыялістычнае будаўніцтва.

Самае галоўнае ў гэтым паходзе, на чым асабліва неабходна сканцэнтраваць увагу, гэта тое, што ўдзельнік паходу за сацыялістычны чырвонец ня толькі сам становіцца ўкладчыкам ашчаднай касы, але адначасова бярэ на сябе абавязацельства завербаваць паўную колькасьць новых укладчыкаў.

Такім чынам з удзельнікаў паходу фармуецца новая армія агітатараў за справу ашчаднасьці, агітатараў, дабраахвотна ўзяўшых на сябе абавязацельства выканаць пэўнае, канкрэтнае заданьне.

Разглядаць удзельнікаў паходу за сацыялістычны чырвонец, выключна як укладчыкаў, — грубейшая памылка, няўменьне стаць на чале ініцыятывы мас і навіраваць яе гэтую ініцыятыву па правільным русьле.

Поруч з недаацэнкай ролі ўдзельнікаў паходу за сацыялістычны чырвонец, як дабраахвотных і найбольш актыўных агітатараў за справу ашчаднасьці, наглядаюцца выпадкі простага парушэньня сутнасьці справы ашчаднасьці—устанаўленьне цьвёрдых тэрмінаў захоўваньня сацыялістычных чырвонцаў, да наступленьня якіх тэрмінаў укладчык фактычна траціць права распараджацца ўкладам (Койданаўшчына); устанаўленьне заданьняў і купюр сацыялістычных чырвонцаў (Тураўшчына).

Гэтыя парушэньні сьведчаць аб поўным неразуменьні задач справы ашчаднасьці—акумуляваць часова вольныя сродкі насельніцтва, зьяўляюцца спробай амэрыцыць жывое цыркуляваньне зьберажэньняў працоўных у дзяржаўных каналах грашовага абароту, супроцьпастаўіць уклады ў ашчадныя касы дзяржаўным пазыкам.

Такога роду скрыўленьням паходу за сацыялістычны чырвонец павінен быць даны цьвёрды і рашучы адпор.

Афармленьне ўкладу «за сацыялістычны чырвонец» зусім не патрабуе прыдуманага—«і абавязуюся хаваць яго да канца пяцігодкі».

Укладчыку «сацыялістычнага чырвонца» павінны выдаваць звычайную ашчадную кніжку, прадугледжаную на тэрміновы ўклад (звыш 3 месяцаў), пры чым у мэтах папулярызацыі тэрміновых укладаў ашчадныя касы павінны растлумачваць укладчыку, што ўнесены тэрміновы ўклад каса абавязана выдаць яму па яго першым патрабаваньні, пры чым пры датэрміновым патрабаваньні ўкладу ўплачваецца 8 проц. гадавых, замест устаноўленых на тэрміновым укладам 9 проц.

Умелае, здаровае правядзеньне паходу за сацыялістычны чырвонец павінна забясьпечыць шырокую папулярызацыю справы ашчаднасьці, зьяўляць на належную палітычную вышыню барацьбу за культурную касу ашчаднасьці.

Фінансавыя і ашчадныя работнікі павінны скарыстаць паход у мэтах замацаваньня справы ашчаднасьці, паляпшэньня работы ашчаднасьці, і рашучага адпору ўсякага роду скрыўленьням у справе ашчаднасьці.

Паход за «сацыялістычны чырвонец»--экзамен на палітычную сьвядомасьць і арганізацыйную гібкасьць фінансавага і ашчаднага апарату.

В. Ляхаў.

У СНК БССР

4 МАЯ 1932 г.

ПРА БАРЫСАЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЗАКАЗЬНІК І ВЯДЗЕНЬНЕ Ў ІМ І Ў ІНШЫХ ЗАКАЗЬНІКАХ ПАЛЯЎНІЧАЙ ГАСПАДАРКІ.

Савет Народных Камісараў пастанавіў перадаць Берысаўскі заказьнік у распараджэньне Народнага Камісарыяту Замежнага Гандлю.

Даручана Белахотсаюзу у працягу бягучага году дасканала абсьледаваць ня менш 50 проц. існуючых заказьнікаў па БССР і арганізаваць замест ліквідаваных, якія не адпавядаюць свайму прызначэньню, новых 15—лясного тыпу і 12—для баброў. Скончыць пачатае ў 1931 г. жыльлёва-гаспадарчае будаўніцтва Барысаўскага заказьніка і біялёгічнай станцыі. Правесьці лесаўпарадкаваньне па заказьніку.

Забясьпечыць біялёгічную станцыю заказьніка неабходнымі гаспадарчымі і навуковымі прыладамі. Разгарнуць вопыты па арганізацыі стацыянара і закрытага пітомніка для прамысловага пушнага зьвера пры заказьніку, разгарнуць работу па падрыхтоўцы кадраў для навуковай працы па заказьніку.

АБ ВЫПРАЦОЎЦЫ КАНЦЭНТРАВАНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ.

Заслухаўшы даклад Навукова-Дасьледчага Інстытуту Прамысловасьці па выпрацоўцы прэцыпітатаў з беларускіх фасфарытаў, СНК адзначыў каштоўнасьць праробленай працы Інстытутам Прамысловасьці па скарыстаньні беларускай сыравіны для выпрацоўкі канцэнтраваных угнаеньняў. Упаўнаважаному НК Цяжкпрома прапанаваць прадугледзець у другой пяцігодцы пабудову прэцыпітатнага заводу ў Крычаве або ў Прапойску.

ПРА ХОД БУДАЎНІЦТВА РАГАЧЭЎСКАЙ ЦЭЦ І БУДАЎНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ РАЁНУ.

СНК вызначыў з бюджэту БССР 1 млн. руб. на будаўніцтва Рагачэўскай ЦЭЦ у дадатак да вылучанага 1 млн на гэту справу Наркамземам СССР.

На народнага камісара НКЗ т. Рачыцкага ўскладзена адказнасьць за арганізацыю і правядзеньне кантролю па будаўніцтве Рагачэўскай ЦЭЦ.

Даручана Дзяржпляну, НКЗ, Наркамснабу, НК Лёгкай Прамысловасьці распрацаваць рэальны плян арганізацыі прадпрыемстваў па першапачатковай перапрацоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў у раёне будаўніцтва Рагачэўскай ЦЭЦ, а таксама падрыхтоўку спажыўцоў і скарыстаньня паравой сілы гэтай станцыі, прыцягнуўшы да гэтай справы Рагачэўскі РВК.

СНК абавязаў Рагачэўскі РВК зьвярнуць большую увагу на разгортаньне будаўніцтва ЦЭЦ, у прыватнасьці узьняць увагу ўсіх мясцовых арганізацый раёну на гэтую справу.

ПРА СТАНОВІШЧА МУКАМОЛЬНЯЎ.

Даручана Дзяржпляну падвесьці сьпісі вытворчай магутнасьці ўсіх млыноў, задавальненьне памолам збожжа патрэб дзяржавы і грамадзкіх арганізацый, а таксама ступень абслугоўваньня калгаснага сялянства мукамольнем, і матар'ял на гэтым пытаньні падаць да 1 ліпеня г. г. на зацьвярджаньне СНК.

СНК абавязаў раённыя выканаўчыя камітэты падаць у Дзяржплян не позьней 15 чэрвеня матар'ялы аб становішчы млынаў у раёне і ступень абслугоўваньня імі патрэб дзяржавы і сялянства.

СНК аслабаніў т. Масюкова ад абавязкаў Старшыні Гідрамэтэаралёгічнага Камітэту, і прызначыў тав. Ізмаматка.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У МАНЧЖУРЫІ ПАШЫРАЕЦЦА

МУКДЭН. 3-IV. Паводле паведамленьня японскі вайсковых крыніц 1 мая, на паўночным захадзе ад Тунляо ідуць баі паміж спэцыяльным японскім атрадам і кітайскімі партызанамі. Пасьля 3-гадзіннай бойкі партызаны адступілі на паўночны захад, страціўшы 100 чал. забітымі і параненымі. З боку японцаў забіта 6 чал. Ля Тунхуа (на паўночны ўсход ад Мукдэну) адбылася сутычка паміж японскім і кітайскім войскам. Японцы страцілі каля 30 чал. забітымі і параненымі. Газэты, аднак, не паведамляюць ніякіх падрабязнасьцяй бойкі.

Згодна паведамленьня з Харбіну японскі выведчы атрад у Сахаляне страціў у бойцы з партызанамі 20 ч. 2.000 чал.

Японскія вайсковыя ўлады ў Мукдэне апублікавалі загад аб неадкладнай адпраўцы паліцэйскіх атрадаў з Сыпінгю, Тэліна, Лиояна, Інхоў і Чанчуня ў Мукдэн, адгэтуль паліцэйскія павінны накіравацца ў раён Тунхуа. Ля ст. Уцзін (усходняя лінія КУЧ) адбылася сутычка паміж японскім і кітайскім войскам. Японцы страцілі каля 30 чал. забітымі і параненымі.

Згодна паведамленьня з Харбіну японскі выведчы атрад у Сахаляне страціў у бойцы з партызанамі 20 ч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня	НОВЫ мастацкі фільм ВЫШЫНЯ 88,5
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз.	Замежны фільм БАЯЗЬЛІВЕЦ
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“	Замежны фільм СУМІКО

ПАСТАНОВА

На падставе пастановы НКП БССР ад 7-га студзеня 1932 г. і Менгарсавету ад 19 красавіка г. г. у мэтах лепшага культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых і служачых у дні адпачынку і правільнага рэгуляваньня электразабясьпечаньня,

Гарадзкі Аддзел Працы прапануе:

1. Ва ўсіх прадпрыемствах часова пераведзеных на шасьцідзённы перапынны вытворчы тыдзень, устанавіць выходныя дні па скальзячай шкале (5 дзён працавіць,—6-ты выходны).

2. Устаноўленьня прадпрыемствамі выходныя дні па цьвёрдых чыслах месяца—адмяняюцца.

УВАГА: Гэта пастанова не распаўсюджваецца на тыя прадпрыемствы, якія працуюць на бесьперапынным вытворчым тыдню, выходныя дні для для іх застаюцца па старым графіку.

3. Устанаўленьне выходных дзён па скальзячай шкале праводзіцца кіраўнікамі прадпрыемстваў у наступным парадку:

1) Завод «Камунар», Скарняжная ф-ка, завод «Ударнік», Мясакамбінат, завод «Чырвоны Хімік», Хімфармзавод, Шпалерная ф-ка, Піваварны завод «Будзетэтляну»—устанаўліваюць першы выходны—10 мая 1932 г.

2) Дрэваапрацоўчы завод, Шклозавод, Шорная ф-ка, Электрастанцыя, Друкарня імя Сталіна, Друкарня газ. «Зьвязда», Друкарня БАН, Друкарня ЦВК і СНК, Друкарня Белдзяржыдавецтва, майстэрня Палаты Мер і Вагі—11 мая г.г.

3) Завод «Энэргія», «Варашылава», ф-ка «Камунарка», «Полымя Рэвалюцыі», Войлачная і Лямцавая ф-ка, Абутковая ф-ка—12 мая г. г.

4) Швэйная ф-ка «Акцябр», Швэйная ф-ка імя Крупскай, Швэйная ф-ка «8-га сакавіка», «Чырвоны Тэкстыльшчык», Шчотачная ф-ка—13 мая г. г.

5) Завод «Бальшавік», Белжмасаюз (будаўніцтва), Мебляржбуд (будаўніцтва), Менбуд (будаўніцтва, цагельныя заводы, ізраэцовы завод, бэтонны завод, цэнтральныя майстэрні), Белбудаб'яднаньне (будаўніцтва, будмтар'ялы), Галянтарэйная ф-ка, Шчаціная ф-ка, Абутковая майстэрня, Сьпірта-Гарэлачны з-д, Мехлачная пральня, Пратэзная мэйстэрня, Крухмальны завод, Патачны завод «Чырвоны Золак», Дрожжа-ва-віншкурны завод, завод «Пралетары», Малочны завод, ф-ка Утыльсыр, Люстэрная ф-ка—14 мая г. г.

УВАГА: Да 10—14 мая выходныя дні прадстаўляюцца па ранней устаноўленым парадку (6 мая).

Прадпрыемствы, якія не пералічаны ў гэтай пастанове і часова пераведзены на 6-цідзённы перапынны вытворчы тыдзень таксама ўстанаўліваюць выходныя дні па скальзячай шкале. Першы выходны дзень для гэтых прадпрыемстваў устанаўліваецца ў адзін з дзён вызначаных для вышэйпералічаных 5-ці груп прадпрыемстваў.

Адказнасьць за правядзеньне ў жыцьцё гэтай пастановы ўскладаецца на кіраўнікоў прадпрыемстваў.

Заг. Гараддзелу Працы ПАРТНЫ

Узгоднена з Гарпрафсаветам КУДРАЕЎ

У адпаведнасьці з пастановай СПА ад 9-VI 1931 г.

3-га мая ў гор. Менску адчынілася

Беларуская Кантора Банку Доўгатэрміновага Крэдытаваньня Прамысловасьці і Электрагаспадаркі

(ПРАМБАНК СССР)

З паказанага числа ўсе разьліковыя апэрацыі па капіт. будаўніцтве прамысловасьці, вытвараўшыяся раней Канторай і Менскім Аддзяленьнем Дзяржбанку,

вытвараюцца Канторай БДК

Сьпіс кантакарэнтных рахункаў капітальнага будаўніцтва Канторы БДК будзе апублікаваны дадаткова

Час. вык. абав. кір. Белканторы БДК БАЙРАШЭЎСКІ

МЕНСКІ ДАШКОЛЬНЫ ТЭХНІКУМ АБВЯШЧАЕ НАБОР НА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

на польскае і яўрэйскае аддзяленьні

Пры паступленьні неабходны даведкі аб скончэньні 6 груп школы, аб сацыяльным становішчы і становішчы здароўя.

Прыём заяў да 25-га мая

Заняткі пачынаюцца 1-га чэрвеня

Студэнты забясьпечваюцца агульнажыцьцём і стыпэндыяй.

Заявы накіроўваць: г. Менск, Савецкая вул., д. № 144

ДЫРЭКЦЫЯ

Згодна пастановы НК Земляробства СССР

з 10-га мая па 15-га мая 1932 году

у г. Менску, у Сьвінаводным саўгасе „Малая Сьляпянка“ НДІ Сьвінагадоўлі АДБУДЗЕЦЦА

ўсесаюзная канфэрэнцыя па мэханізацыі сьвінагадоўлі

Канфэрэнцыя мае сваёй мэтаю практычную распрацоўку і падрыхтоўку канкрэтных пытаньняў для складаньня пляну мэханізацыі сел.-гаспадарчай вытворчасьці на 2-ю пяцігодку ў галіне сьвінагадоўлі.

Па ўсіх пытаньнях канфэрэнцыі зьвяртацца да Аргкамітэту: г. Менск, тэрыторыя был. Выстаўкі, Бел. Аддз. Усесаюзнага Інстытуту Мэханізацыі і Электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

АРГКАМІТЭТ

7-га мая а 4 гадзіне дню

ў залі паседжаньняў ЦСПСБ, Дом Працы, 2 пав., пакой 10

АДБУДЗЕЦЦА ПЛЕНУМ Бел. МБІТ'у

Яўка членаў і кандыдатаў ПЛЕНУМУ абавязкова

Прэзыдыум Бел. МБІТ'у

З 1 мая г. г. пры Менскім дашкольным тэхнікуме

АДКРЫВАЕЦЦА ЗАВОЧНЫ СЭКТАР

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ад работнікаў дашкольных устаноў усіх тыпаў

Заявы падаваць: Менск, Савецкая, 144, дашкольны тэхнікум, ЗАВОЧНЫ СЭКТАР

ТУРСКАЙ СЭЛЕКЦЫЙНАЙ СТАНЦЫІ па лугапашавых травах

ПАТРАБУЮЦЦА

1. Заг. аддз. сэлекцыі лугавых траў, ён-жа і навуковы кіраўнік станцыі. АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
2. Сэлекцыянер на бабовых з акладам 250 руб.
3. Сэлекцыянэр па лугавых злаках з акладам 250 руб.
4. Агранам семенавод мэханізатар з акладам 300 руб.
5. Агранам семенавод экаманіст з акладам 250 руб.
6. Геобатанік-лугавод з акл. 250 руб.
7. Зав. хімічнай лябораторыяй з акл. 300 руб.
8. Энтомолог з акладам 250 руб.

Прадстаўляецца бясплатна кватэра, ацяпленьне і асьвятленьне

Прадукты па цьвёрдых цэнах

Адрас: БССР, п-а, Гадзіловічы, Турская сэлекцыйная Станцыя

Дырэктар станцыі РАДКЕВІЧ Р. Г.

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“

ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА

на вячэрнюю работу

Зьвяртацца: Пляц Волі, 17, 1-ы паверх, тэлефон № 4-78.

ЗГУБЛЕН чыг. бязімянны гадавы білет № 3903, які належыць Негарэлаўскай таможні на праезд Негарэлае—Менск, выдадзены станцыяй Негарэлае

Лічыць несапраўдным

Нарсуд Чэрвеньскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Вераб'ю Юрку Пятроваму, Вераб'ю Пятрусю Цімахозаму і Аўсянскаму Пятру Аметыянаваму, жых. шасёлку «Селянін», Калодзецкага сельсавету, за тое, што яны, будучы прызначанымі партаўнікамі па ахове кулацкай маёмасьці, дапусьцілі тэтага-ж кулака разбазарваць маёмасьць, а таксама купілі яе самі, у выніку чаго нехапіла шмат маемасьці.

Нарсуд Чэрвеньскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Ганчаньну А. А., бухгальтару саўгасу «Вузьдзенец» за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Чэрвеньскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Ноўікаву Раману Савельеваму за нядбайныя адносіны да хаваньня выбухоных матэрый.

ЗГУБЛЕНЫ:

Членскі